ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 152 (387) Нядзеля, 9 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у чацьвер, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90 | Адрас Выдавецтва: ЦК ЛКСМБ, „Чырвоная Зьмена“ Менск, Комсам. 35.

Агляд нашых дасягненьняў.

(Да працы Х-га зьезду КП(б)Б).

Унутрыпартыйная праца КП(б)Б за мінулы год прыняла нябывалы да гэтуль размах. Партыя пры немажлі ва цяжкіх і складаных задачах будаўніцтва соцыялізму, тэорэтычна ўзброілася з такім разьлікам, што 20 тысячная армія ленінцаў магла на ўсіх вучэстках вырашаць практычныя пытаньні і пункту гледжаньня правільнага учоту ўсіх матэрыяльных прадпасылак, на аснове бальшавіцкага разуменьня абстановы.

Унутрыпартыйная дэмократыя, якая паступова праводзіцца, ахапіла ўсе зьвеньні нашае партыі, стала не падзельнай часткай унутрыпартыйнага жыцьця. Актыўнасьць шырокіх партыйных мас вырасла ў сувязь з рабочым, з працоўным сялянствам. Вакол партыі стварылся зараз бесспартыйны актыў, які ўцягваецца ў выкананьне задач, пастаўленых перад КП(б)Б.

Мінулы год падкрэсьліў вае няўхільны рост тэорэтычнага разуменьня нашай рэволюцыйнай бальшавіцкай практыкі. Вывучэньне пастаноў XIV-га зьезду партыі ўсіх разьходжаньняў партыі з опозыцыйным блёкам прыняло такі размах, што мы з упэўненасьцю можам сказаць, што той моцны адпор, які дала КП(б)Б рашучым, ёсьць вынік не фармальнага імкненьня захаваць адзінства нашае партыі, а разуменьне навучаньня Леніна, поўнае ўсьведамленьне праўдзівасьці партыі, якая, выбіраючы на ленінскія аналізы ўмоў развіцьця, вядзе політыку адпавядаючую міжнародным задачам пролетарскае рэволюцыі.

Унутрыпартыйная работа партыі, палепшаньне класавага складу, вылучэньне нізавога партактыву на кіруючую працу, шырокае абмеркаваньне ўсіх практычных пытаньняў на партыйных колектывах, павялічэньне адказнасьці ўсімі і кожным за фактычнае выкананьне дырэктыў—палепшылі якасьць нашае працы. Тая неадпаведнасьць між якасьцю і колькасьцю, якая так адбівалася на працы ў мінулым, зараз зьмякчылася настолькі, што ніякіх рэцыдываў у гэтых адносінах ня будзе. Пытаньне аб якасьці нашай унутрыпартыйнай працы і усяе працы партыі зараз стала ядром, вакол якога згуртоўваецца ўся ўвага КП(б)Б.

Бліжэй да мас, з масамі, прыслухоўвацца да голасу мас, умець організоўваць, практычна організоўваць, конкрэтна організоўваць—вось задачы, якія сталі і стаяць перад намі ў далейшым.

КПБ будзе расьці, як сапраўдная бальшавіцкая організацыя пры умове ўпартага, нясупыннага працы у ўзятай лініі організацыйнага будаўніцтва. У нашу партыю ўліліся новыя кадры ленінцаў, далучаных да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. Пролетарская база будаўніцтва пашырылася. КПБ будзе чэрпаць новыя сілы, будзе ўмацняць пролетарскі склад сваіх шэрагаў, КПБ будзе стойкім атрадам Усесаюзнай Комуністычнай партыі!

Хроніка працы зьезду.

IV і V пасяджэньні 5-1.

Увесь дзень цягнуліся спрэчкі па докладах т. т. Крыніцкага і Галадзеда.

VI пасяджэньне 6-1.

Да палудня спрэчкі па докладах ЦК. Усяго выказалася 43 т. т. з агульнага ліку 132, якія запісаліся ў спрэчках. Ухвалена спыніць спрэчкі.

VII-ае пасяджэньне 6-1.

Пасяджэньне пачалося заключным словам т. Галадзеда. Потым зьезд заслухаў заключнае слова т. Крыніцкага, якое было выслухана ўсім зьездам з напружанай увагай. Апошнія словы т. Крыніцкага выклікалі доўгія і бурныя воплескі. Абрана камісія у складзе 15 асоб для распрацоўкі рэзолюцыі па докладах ЦК.

VIII-ае пасяджэньне 7-1.

Ранішняе пасяджэньне пачалось докладам т. Патэрса аб дзейнасьці ЦКК УсеКП(б).

Прывітаньне ЦК УсеКП[б].

Х зьезд КП(б)Б пасылае шчырае прывітаньне кіруючаму штабу нашае партыі—Ленінскаму ЦК.

Практыка гаспадарчага, унутрыпартыйнага і культурнага будаўніцтва, праводзеньне нацполітыкі за мінулы год нават на такім невялічкім вучастку Саюзу, як наш няўхільна сьведчыць аб тым, што мы ня толькі можам будаваць соцыялізм, але што мы СССР—пабудуем яго канчаткова.

Велізарны рост актыўнасьці рабочай клясы, які ідзе па нашым руслу, усё новыя гушчы беднякоў вёскі і лепшых серадзякоў, якія гуртуюцца навокал партыі і Ленінскага ЦК УсеКП—усё гэта лішні раз адхіляе «прадсказаньні» банкрутаў—опозыцыйных лідэраў.

Х зьезд КП(б)Б аднадушна сьцьвярджае што гэтыя посьпехі маглі быць дасягнуты толькі ў выніку правільнага ленінскага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б).

Знаходзячыся на рубяжы Савецкага Саюзу, выразна разумеючы складанасьць і адказнасьць міжнароднага становішча, захоўваючы непарушнае ленінскае адзінства сваіх шэрагаў,—КП(б)Б і надалей будзе пад правільным кіраўніцтвам ЦК УсеКП камень за каменем складаць будынак соцыялізму да канчатковай яго перамогі ва ўсім сьвеце.

Прэзыдыум Х сьезду КП(б)Б.

Ячэйцы ЛКСМБ БДУ

шчырае прывітаньне ў дзень сьвяткаваньня 5 ці гадавога юбілею.

Ваша задача заключаецца ў тым, каб комсамольцам студэнтам і ўсяму пролетарскаму студэнцтву забясьпечыць максімум акадэмічнай пасьпяваемасьці побач з агульным умацненьнем Вашай грамадзкай працы.

Трэба памятаць, што ўся вучоба Ваша павінна быць падпарадкавана грунтоўнай задачы—падрыхтаваць з сябе высока кваліфікаваных чырвоных спецаў для дапамогі Партыі і Савецкай уладзе будаваць соцыялізм.

У сваёй працы—бліжэй да рабочых ячэек, бліжэй да пролетарскага студэнцтва.

Сакратар ЦК ЛКСМБ А. БАРАНЬНІКАЎ.

За межамі.

Фашысцкая салідарнасьць.

Італьянскі пасол у балтыцкіх дзяржавах Стамеры паведаміў літоўскі ўрад, што італьянскі ўрад пастанавіў прыслаць у Літву свайго сталага дыплёматычнага прадстаўніка.

Гэтым крокам Італія хоча падкрэсьліць сваю сымпатыю да фашысцкага перавароту ў Літве.

Суд над прадстаўнікамі скінутае ўлады.

Бышы начальнік літоўскага генэральнага штабу палкоўнік Шкірпэ шмат афіцэраў генэральнага штабу і б. начальнік ковенскае політычнае поліцыі, водлуг загаду сучаснага ўраду адказаны пад палявы суд.

Супроць тэрору фашыстаўскага ураду!

Што адбываецца у панскай Польшчы

(Адозва Цэнтральнага Комітэту Комуністычнай партыі Польшчы)

Фашыстаўскі ўрад Пілсудзкага рыхтуецца да новага крывавага злачынства над прыгнечанымі рабочымі і сялянамі Зах. Беларусі.

Тэрор, які пануе па ўсёй Польшчы супроць рабочае клясы і сялянскіх масаў, разгульвае са стократнай сілай на землях Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Нагайка і штык поліцэйскага і асадніка—гэта ўсе уладныя паны жыцьця і сьмерці мільёных сялянскіх масаў.

Найдзічэйшымі рэпрэсіямі фашыстаўскі урад стараецца выжыць украінскіх і беларускіх сялян з іх зямель і аддаць асаднікам, вырваць родную мову, задушыць барацьбу беларускіх і ўкраінскіх прац. мас за зямлю, за вызваленьне з пад ярма акупацыі і аб'яднаньня разарваных беларускіх і ўкраінскіх зямель з сумежнымі савецкімі рэспублікамі—Сав. Беларусі і Сав. Украіны. Тысячы беларускіх і украінскіх сялян гніюць у турмах. Масавыя процэсы (процэс „94“ у Вільні, процэс „57“ у Луцку, процэс „151“ у Уладзімеры Валынскім, адчаяныя барацьба галадоўкамі звыш 200 політычных вязьняў у Вільні ў турме на Лукішках—вось правы гэтай запальчывай барацьбы.

Крывавы тэрор нічога не дапаможа

Аграмадны ўздым вызваленчага руху беларускіх масаў выклікаў да жыцьця ма угную організацыю—Беларускую Работніцка Сялянскую Грамаду.

Але фашысцкі ўрад ня можа дапусьціць існаваньня на Беларусі якіх небудзь масавых організацый, апрача тых, якія былі-б гатовы выслугоўвацца яму і адцягваць масы ад барацьбы. Дзеля таго, ён усімі спосабамі прасьледуе ўсялякую праяву вызваленчага руху, душыць і прасьледуе ня толькі комуністычную партыю Зах. Беларусі—кіраўніка рэволюцыйных масаў. Нават і легальную радыкальную організацыю Работніцка Сялянскую Грамаду ён хоча за ўсялякую цану разьбіць, хоча зрабіць немагчымым яе існаваньне. Сотні і тысячы сяброў Грамады арыштоўваюцца, караюцца грашмі за ўдзел у легальных сходах, за аддаваньне кватэры на сходы, за самую належнасьць да Грамады.

Крывавы плян.

Мы ўжо бачым першыя спробы праведзеньня ў жыцьцё гэтага пляну.

Павятовы зьезд Грамады ў Старым Бярозаве, у Бельскім павеце быў акружаны кулямётамі, а банды поліцыянтаў, прыехаўшыя на самаходах, зьверскім спосабам напалі на безабаронных сялян, калечачы іх бязьлітасна, у тым ліку і двух паслоў Грамады.

Урад окупантаў стараецца справакаваць адчаянны рух рух самаабароны, каб мець прычыну да крывавай расправы над беларускім народам.

Урад Пілсудзкага рыхтуецца да вайны з СССР.

Працоўныя масы Польшчы!

Выступім з усёй сілай проціў гэтых праступных махінацый!

Рабочыя, сяляне! Хай ня будзе ні аднэй фабрыкі, капальні ні аднаго варштату працы, ані аднаго сходу і мітынгу, на якім бы польскі работнік і селянін ня ўзьнёс свайго голасу супроць провокацыі фашыстаўскага ўраду!

Няхай ніводзін работнік і селянін не застаецца глухім на кліч сваіх беларускіх братоў!

Няхай магутны голас працоўнай Польшчы будзе выразам нязломнай салідарнасьці працоўнага люду Польшчы з беларускімі і ўкраінскімі братамі ў супольнай барацьбе супроць фашыстаўскага ўраду абшарнікаў і капіталістых!

Таварышы, рабочыя і сяляне Зах. Беларусі!

> **Твар польскага ураду...**
>
> Польскі міністр замежных спраў Залескі заявіў: Польшча гатова пачаць перагаворы з СССР аб заключэньні гарантыйнага дагавору. У той жа час Пілсудзкі стварае у Галіцыі і на Валыні базу для падрыхтоўкі захопу савецкай Украіны.
>
> (З тэлеграм).



..адзіны, але два твары.

„Ня дайце правакаваць сябе“.

Не дапусьціце, каб ураду фашызму ўдалося разьбіць фронт працоўных масаў, затапіць ваш рух у крыві і нанасіць нам удары на кожнай паасобнай частцы нашага фронту.

Толькі ў цесным саюзе, толькі ў салідарнай барацьбе працоўных масаў усяе Польшчы ёсьць гарантыя перамогі над урадам капіталістых абшарнікаў.

Організуецца магутная сіла.

Як стойкія салдаты рэволюцыі, вытрымлівайце барацьбу на сваіх пастох! Наперакор крывавым рэпрэсіям організуйцеся ў магутную сілу, вядзіце на кожным кроку кожнага дня бязупынную барацьбу за свае правы, барацьбу за лепшую будучыну. Але памятайце, што да апошняй барацьбы, да ўзбройнага паўстаньня пойдзеце толькі разам з рабочымі і сялянамі ўсяе Польшчы. Не тады, калі хітры вораг захоча вас справакаваць і ў крыві затапіць, але тады, калі комуністычная партыя дасьць кліч па ўсёй Польшчы да ўзбройнага паўстаньня, кліч да апошняй расправы з эксплёататарамі і прыгнятацелямі народаў!

Ведайце, што ўсе працоўныя Польшчы з вамі! Хай наша салідарнасьць дадасьць вам трываласьці і сілы! Хай яна вам паможа вытрымаць на цяжкім часту пад страшэнным тэрорам нашых супольных ворагаў.

Салдаты! Хай ні адзін штых, ні адна куля з вашых рук ня будзе накіравана супроць вашых беларускіх братоў! Ня дайце выкарыстаць сябе, як сьляпое аружжа ў руках фашыстаўскага ўраду ў інтарэсах магнатаў і фабрыкантаў!

Далоў правакацыю ўраду крэсавых зуброў, ураду вайны з СССР!

Няхай жыве адзіны фронт рабочых і сялян польскіх, беларускіх, украінскіх, нямецкіх, яўрэйскіх і літоўскіх да барацьбы за зьнішчэньне фашысцкай дыктатуры, за рабоча-сялянскі ўрад.

Цэнтральны Комітэт КПП

Сьнежань 1926 г.

Хто нам верне былую красу?

Вёску Крывасельле з ранейшым панскім маёнткам злучала шырокая дарога, высаджаная галінастымі бярозамі, стройнымі таполямі, задумлівымі вербамі.

Як прыемна для вока і радасна на сэрцы, калі глядзіш бывала на вясёлую чорную градку лесу, канец якой непрыкметна зьліваецца з паверхняй раўніннага капыльскага чорнаёму.

У дарагія майскія вечары, калі паветра—не паветра, а разьліўное мора арамату, калі, срабрыстыя зорачкі весела гуляюць у карагод і яшчэ весялей скідаюцца ў нязьмерную даль, калі чалавек адчувае непаўторную весновую ўрачыстасьць—крывасельская моладзь пакідала хаты свае душныя, біцкоў працай змораных і шнурочкам, як вуцянят кі, выходзіла на прысаду дарогі, адкуль неадрыўна цалавала сваімі сакалінымі вачыма захад далёкі, што ахапіла ранаўся ў чарнаватую кашулю.

Тут можна было пагуляць, падслухаць мілагучны рухавы шопат адзінокіх бярозак, разьліўны сьвіст салаўёў, які водгульлем нёсься на паплавы, да люстраных вод вясеньніх выжарын...

... А ў завейныя дні сьцюдзёнай і злоснай зімы... Калі сьлед дарогі між вольна зьліваўся з бязьмежнай, сьнежнай раўнінай, калі праезджыя падводы змораваліся, пракладаючы новую, хоць невялічкую сьцежачку—як радасна было ўзьехаць на шлях высаджаны адвечнымі дрэвамі, як прыемна было ў зацішку высунуць морду з пад кажуха і страсьці сьнежныя плямы з каўняра.

Цяпер крывасельская дарога—як і ўсе іншыя прасёлачныя дарогі: у майскія дні на яе ня выходзіць моладзь пасьпяваць, у вялікія завеі ніхто ня можа спакайней уздыхнуць, бо ад прысады засталіся адны чорныя пні.

Няма красы ранейшай, няўчуеш залаты сьвіст салаўя.

З гэтым ніяк ня можа згадзіцца крывасельскі пажылы селянін, які на сваім вяку бачыў культуру Нямеччыны, які ў часе вялікай імпэрыялістычнай вайны хадзіў па нямецкіх шляхох, высаджаных дрэвамі, які з маленства ўпіваўся прыгожасьцю крывасельскай прысады.

Ен сарацованай рукой, пад цьмянае сьвятло шкляной газовачкі выводзіць чытэльныя літары на шэрым кавалку паперы, каб заўтра паслаць «заметачку» ў комсамольскую „Зьмену“. Скончыў пісаць і сам з радаснай ухмылкай чытае:

— „Яшчэ ў гэтым лісьце пішу адну заметачку, вельмі бальную, каторая ні ўякім разе не дапусьціма. Наш сельсавет, я думаю, за гэта павінен атвечаць. Дзела гэтакага рода, каля нашай вёскі быў двор, дзе дарога ад двара была асаджана скрозь да самых вёсак дрэвамі. Расьлі там таполі, клёны, асіны і г. д., дзе вельмі добра было глядзець на гэту красату! Гэта навокал нашай вёскі і другіх прымяніма была нямецкая культура, дзе ніводкай дарожкі няма, каб ня была абсаджана дрэвам. Я гэта бачыў у часе вайны...

І што-ж, наш сельсавет з гэтым дзелам зрабіў? Калі дрэвы расьлі па 150 год, як мне казаў раней бацька, дык сельсавет дазволіў некаторым сялянам зрэзаць гэту прыгожую прысаду на дровы. І што-ж вышла? Цяпер глянь на гэту дарогу, дык з старых вочаў аж сьлёзы капаюць. А што за харасство было, калі расьлі гэтыя дрэвы, калі едзеш гэтаю дарогаю, то не налюбуешся, асабліва вясною і летам. На пасьледак я кажу, што за гэта дзела трэба прыўлеч нашага старшыню сельсавету..“

Чаму крывасельскі барадаты селянін з такім „бальным“ фактам зьвяртаецца да комсамольскай газэты?— На гэта ён сам дае найлепшы адказ:

— „Люблю я КСМ і газэту „Чырвоная Зьмена“ таму, бо яны заліхвацка сочаць за працаю сваіх хлопцаў у сельсавеце, хваляць тых, хто стараецца дабра нам—вясковай беднаце...“

Гэтыя словы бедняка-селяніна—ня звычайныя словы! Ен іх напісаў тады, калі прачытаў у «Зьмене» пра добрую працу комсамольца старшыні аднаго сельсавету свае, Слуцкае акругі Міхася Шпілеўскага, калі даведаўся аб дарагой ахвярнай комсамолцы Пакуш Палагеі, якая працуючы старшынёй сельсавету павяла будаўніцтва дабрабыту сваіх вёсак на зьдзіўленьне ўсёй лясістай мазыршчыне.

Хай гэты невялічкі ліст крывасельскага селяніна, які шчыра просіць рэдакцыю не „пячатаць“ яго прозьвішча,—будзе баявым наказам новым сельсаветчыкам-комсамольцам!

Зьм. Паваротны.

Возьмемся за вывучэньне Беларусі!

Цэнтральнае Бюро Краязнаўства і Вышэйшы Савет Фізкультуры Беларусі распачалі працу па організацыі падарожніцкага руху на Беларусі. Мэта яго—вывучэньне Беларусі і фізычнае выхаваньне.—Комсамольцы слаба ўдзельнічаюць у краязнаўчай працы.

Дарогу турыстам.

(Гутарка з сябрам ВСФК—доктарам Душманом).

Прапрацоўкай пытаньня організацыі турызму ў Беларусі ў сучасны момант заняты Вышэйшы Савет Фізкультуры Беларусі і Цэнтральнае Бюро Краязнаўства пры Інбелкульце.

Ў задачы турызму ўваходзіць, як узмацненьне організму чалавека, так і вывучэньне ім прыродных, эканомічных і соцыяльна-бытавых умоў краіны.

Турысцкі рух моцна разьвіўся ў Заходня Эўропэйскіх краінах, галоўным чынам у Нямеччыне.

Там таварыствы турыстаў вельмі ўзмацнелі, як з боку матэрыяльнай базы, так і з боку ўзросту ініцыятывы і ліку сяброў турысцкіх таварыстваў. Вось напрыклад: у Шварцвальдзе і Вогезах на свой кошт гэтыя таварыствы—пабудавалі ў лясох добрыя шляхі, домікі і будачкі. Турыст мае ў гэтым доміку прытулак для адпачынку.

У нас у СССР першым прыкладам масавага турызму, можа служыць паездка рабочай моладзі Масквы на фабрыкі і заводы Ленінграду.

Але гэта вылазка турыстаў паказала, што да гэтай справы адпаведныя організацыі ня былі дастаткова падрыхтаваны. Для турыстаў былі прадстаўлены вельмі нязначныя ільготы на праезд па чыгунцы і асабліва па водным шляхам. Ня было базы для прыёмкі турыстаў і больш усяго экскурсія ішла бяз строга і правільна вызначанага пляну.

У СССР ёсьць усё-ж такі адно таварыства на Каўказе, якое добра паставіла турысцкую справу.

* * *

У нас у Беларусі мэтавая ўстаноўка турызму павінна пайсьці па шляху як фізычнага так і культурнага разьвіцьця моладзі. Турызм адыграе асабліва вялікую ролю ў справе вывучэньня нашай краіны і падняцьця культурнага ўзроўню моладзі.

Для гэтай мэты ЦБ краязнаўства і ВСФК Беларусі пытаньні па падрыхтоўцы азнаямленьня будучых турыстых з такімі ведамі як: гэолёгія, батаніка, гістарычныя і экономічныя асаблівасьці Беларусі. Такім чынам, турыстыя адначасова з карысным будуць злучаць і прыемнае. Яны будуць фізычна і культурна разьвівацца і дапамагаць краязнаўчым таварыствам у іх працы.

Пакуль што формы турызму не ўстаноўлены. Але відавочна, яны выльюцца ў дабраахвотныя таварыствы з цэлым шэрагам ячэек на мясцох.

Ёсьць упэўненасьць, што грамадзкасьць пойдзе шырока насустрэч гэтаму здароваму культурнаму руху.

К.

Праца па краязнаўству наладжана.

(Пухавіцкі раён, Меншчына).

Дзякуючы таму, што ў нашым раёне ёсьць садова-агародніцкі тэхнікум і дзьве сямігодкі з якімі райбюро трымае цесную сувязь, краязнаўчая праца ў апошнія часы значна палепшылася.

Гэта відаць хоць-бы з таго, што ўжо пачалі складаць раённую карту ў некалькіх экзэмплярах, добра організаваны збор слоў жывой мовы. Членам таварыства Шатэрнікам запісана на карткі 4000 слоў і то ўсяго толькі да літары К.

Краязнаўчы гурток пры садова-агародніцкім тэхнікуме сабраў шмат экзэмпляраў па прыродазнаўству і сельскай гаспадаркі для краязнаўчага музэю.

У сучасны момант праводзіцца перарэгістрацыя і вярбоўка новых сяброў у краязнаўчыя гурткі.

Раённай комсамольскай організацыі трэба дапамагчы ў праведзеньні гэтых добрых пачынаньняў, шляхам растлумачваньня сярод сялянскай моладзі значэньня вывучэньня свайго краю.

І. Г.

Няма кіраўніцтва

(Мястэчка Зембін, Барысаўшчына)

Краязнаўчая праца ў Зембіне зусім слаба праводзіцца.

Яшчэ ў мінулым годзе быў організаваны краязнаўчы гурток пры Зембінскай сямігодцы, але ён ня змог разгарнуць сваю працу. Некаторымі сябрамі гуртка, за час водпускаў, было сабрана шмат народных песень, але па невядомым прычынам гэтага матар'ялу папала ў гурток мала. Таксама было і з зборам слоў жывой мовы. Гэта ўжо сьведчыць аб слабай зацікаўленасьці краязнаўчай працай з боку сяброў.

Трэба яшчэ адзначыць слабую зацікаўленасьць гэтай працай комсамольскай фракцыі пры сямігодцы. Ёсьць шмат вучняў—комсамольцаў у якіх ёсьць сабраны матар'ял і яго не здаюць, а фракцыя на гэта не зьвяртае ўвагі.

Наогул гурток працуе дрэнна, бо на яго ніхто не зьвяртае ніякай увагі.

Э. М.

Беларускі Дзяржаўны Музэй.

Гутаркі з дэлегатамі Х-га зьезду КП(б)Б

„Кастрычнік“ і „Комінтэрн“.

(Бабруйшчына).

Справы кваліфікацыі

За апошнія часы ў нас заўважваецца,—кажа тав. Сьцяпанаў,—што рабочая моладзь вельмі зацікаўлена ў вытворчасьці. Яна стараецца, ня гледзячы на розныя супярэчнасьці, і здабывае ўпарта і няўхільна кваліфікацыю.

Тав. Сцяпанаў.

Вось, напрыклад, па хімічнай прамысловасьці (шкляныя гуты „Кастрычнік“ і „Комінтэрн“) хлапцы дабіваліся кваліфікацыі праз індывідуальнае навучаньне.

За гэты час з вучняў-падросткаў на гэтых заводах стала 30 майстроў-выдувальшчыкаў, 35—памочнікаў-выдувальшчыкаў. З зусім яшчэ маладых хлапцоў пераведзены ў баначнікі—75 чал. (у гэтым ліку 5 дзяўчат).

Дзяўчаты—не кваліфікуюцца.

З дзяўчатамі — бяда. Адчуваецца нейкае да іх недавер'е. Рабочыя чамусьці прывыклі думаць, што з дзяўчыны ніколі ня можа быць майстра.

Дзеля гэтага хоць дзяўчат на шкляных гутах і шмат працуе, але з іх амаль ніхто не атрымоўвае належнай кваліфікацыі.

«Гістарычны звычай».

Невядома чаму, але сярод старых-рабочых засталіся яшчэ старыя традыцыйныя звычаі—навучаць кваліфікацыі толькі сваіх дзяцей і крэўных. Старычкі стараюцца кваліфікацыю рабіць «сэкрэтам» для іншых падросткаў, якія па той ці іншай лініі ня маюць з імі крэўнай сувязі.

З гэтай прычыны ў звычай пачынаюць устанаўлівацца хабарніцтва, падхалімства.

Комсамол таксама вядзе з гэтымі хібамі самую рашучую барацьбу.

Па прадпрыемствах Гомельшчыны.

Гомельшчына мае шэраг такіх буйных прадпрыемстваў, якімі і ня сорам пахвастацца. Вось напрыклад „Везувій“ (запалачная ф-ка) „Добруш“ (папяровая ф-ка) і чыгуначныя майстэрні—гэта такія прадпрыемствы, якія маюць у сябе ня меншчымся па 1500—2000 рабочых кожная. На гэтых жа 3-х прадпрыемствах працуе да 1.500 чал. рабочай моладзі.

Ёсьць яшчэ 9 прадпрыемстваў якія налічваюць у сябе кожная ад 300 да 500 чал. рабочых. І тут таксама моладзі працуе да 900 чал. На дробных прадпрыемствах таксама працуе ня мала моладзі.

Рэжым экономіі.

Разам з старыкамі рабочымі—моладзь пляча ў плячо змагалася і змагаецца за якасьць продукцыі, за рэжым экономіі.

Вось напрыклад цяпер фабрыка „Везувій“ заваявала навят месца і на замежных рынках. Гомельскія запалкі „Везувій“ у сваіх прыгожых запакоўках ідуць за межы, і сьпыт на іх вялікі там.

На ф-цы „Добруш“ за праведзеньне кампаніі за 2 месяцы налічвалася 72 чалавека-дні прагулаў. Пасьля праведзеньня за гэты-ж тэрмін было толькі—22.

Група дэлегатаў з Гомельшчыны. Т. т. (справа на лева) Плятэс, П...пенкоў, Шульман і ўнізу Ігнатовіч

Іваноў—вынаходзец.

Вось скажам комсамолец Іваноў. Гэта быў чудакаваты хлапец у Гомельскіх чыгуначных майстэрнях.

Але аднойчы ён зьдзівіў рабочых і хлапцоў адной ідэяй. Іваноў заявў, што яму ўдалося знайсьці нейкае ўдасканаленьне ў адной машыне.

Вынаходка гэта была прыня...

Конкрэтныя заданьні

Комсамольцы і навуковая праца

(Слоўнік мовы Меншчыны)

Аб спосабах і задачах навукова-краязнаўчай працы ў нас ужо пісалася. Мы ўпэўнены, што комсамольцы, паказаўшыя свае карысныя посьпехі ў політычным і культурна-гаспадарчым будаўніцтве краю, не адмовяцца прыняць чынны ўдзел у навуковай працы. Гэта вельмі магчыма. Толькі трэба акуратная і старанная праца, да якой комсамольцам не пачынаць прывыкаць.

Народная мова Меншчыны значна адрозьніваецца ад літаратурнай. А веданьне мясцовай народнай мовы дае магчымасьць як найлепшага ажыцьцяўленьня змычкі гораду з вёскай, сувязі з шырокімі масамі, найлепшага навучаньня ў школе, узбагачэньня літаратурнай мовы і г. д. Вось і трэба сабраць багацьці народнай мовы Менскай акругі ў Менскі Краёвы Слоўнік.

Як разьбіраць словы

Усе словы, якія толькі можна пачуць у межах Менскай акругі, трэба запісваць, не зважаючы ці супадаюць яны з літаратурнаю беларускаю або рускаю і іншаю моваю, ці не. Запісваць лепш ад старых людзей і пераважна ад жанчын. Ня трэба баяцца, што запісанае табою запіша яшчэ хто. На памяць ні пакладацца—усё, што чуеш зараз жа запісвай. Правілы: 1) запісвай па адным слову на адной картцы паперы з аднаго боку; 2) калі ліст паперы з звычайнага сшытку разрэжаш на 4 часткі — атрымаеш патрэбны разьмер карткі; 3) уверсе карткі пісаць мясцовае слова; пад ім—назву парасійску, польску, або тлумачэньне словамі; па сярэдзіне—назва, у якім слова пачута; уніз—назву хутара, або вёскі, сельсавету і раёну, у якім слова пачута і сваё імя і фамілію, напрыклад:

> Дарежань—скотны двор.
> Бык ужо на дарежні.
> В. Александраўка, Горкаўскага с/с. Чэрвенскага р.
> м. Касьпяровіч.

Памер карткі тут зьменшаны ў 4 разы; 4] абавязкова пастаў націск у першым слове; 5) пішы разборчыва; 6) запісвай на слых—як чуеш і ніколі ня слухай ніякіх правіл ніякай граматыкі (кажуць: і сьмяесься, а ні сьмяешся і г. д.); 7) карысна мець рысунак таго, што слова азначае; 8) усе запісаныя словы прысылай па адрасу: Менск, Рэволюцыйная 21 Цэнтральнае Бюро Краязнаўства. Марак ня трэба—ідзе бясплатна. Рабі надпіс на конверце: з матар'яламі ў Менкрайслоў.

Што запісваць.

Запісваць трэба і назвы і дзеяньні і прыметы і інш. словы, напр.; язда, ехаць, яжджалы, явой і г. д. Каб лягчэй было—даем ніжэй пытаньні. Можна выбраць сабе разьдзел і пераважна з яго запісваць.

1. Словы адносна нябесных сьвяціл і зьяў, якія знаходзяцца у сувязі з іх чынасьцю (назвы зорак, сузор'яў, комэт; назьвы сонца, месяца і г. д.)

2. Назвы розных зьяў у паветры. Назвы стану паветра. Назвы азначэньняў цяпла і холаду, пагоды і нягоды. Назвы хмар, дажджоў, сьнегоў і г. д.

3. Назвы фізычных процэсаў у прыродзе. Назвы процэсаў, якія адбываюцца пры награваньні і астуджаньні, пад уздзеяньнем ... і расьпыльваньня і г. д. Назвы хімічных процэсаў (гніцьце, розныя фэрмэнтацыі і г. д.).

4. Назвы форм земнай паверхні і процэсаў, якія адбываюцца у сувязі з ее зьмяненьнем (шчыліны, адхоны земнай паверхні і г. д.), назвы гор, узгоркаў, даліны, лагчыны, яроў. Назвы нябегучых (рэчка, балота, возера) і падземных (крыніца, ручай) вод. Назвы берагоў, астравоў, затак і інш.

5. Назвы розных земных парод і пластоў, іх формы і пабудовы. Назвы мінэралаў і мэталаў. Назвы розных каменьняў і руд. Назвы розных акамянеласьцяй.

6. Назвы розных расьлін (дрэвы, травы, кветкі, ягады, грыбы). Назвы частак расьлін (ліст, корань, насеньне, кара і г. д.). Назвы зьяў з жыцьця расьлін (красаваньне, выцьвіваньне і г. д.)

7. Назвы розных жывел (зьвяры, хатнія жывелы, птушкі, рыбы, гады, казюлкі і інш.). Назвы частак цела жывел (морда, сківіца, вантробы, хвост, капыці і г. д.).

8. Назвы частак цела чалавека і процэсаў, што адбываюцца у розных органах (мозаг, страва, вока; дыханьне, стравіваньне, псыхічныя процэсы і г. д.).

9. Назвы, якімі азначаюцца асаблівасьці фізычнага тыпу чалавека, напр., самыя розныя віды калецтва.

10. Назвы розных нацыянальнасьцяй, а таксама плямённых і мясцовых груп (цыганы, маскаль, лях, мазур, пінчук, віленчук і г. д.)

11. Назвы хаты і іншых відаў будоўлі (стадола, восець, сьвіран і г. д.). Назвы складаных частак будоўлі (страха, шчыт, балька і г. д.).

12. Назвы хатніх прылад. Назвы мэблі ды прылад для ежы, адпачынку, мыцьця і г. д.).

13. Назвы адзежы і абутку. Назвы матэрыяў самаробных і купленых.

14. Назвы розных напояў і страў.

15. Назвы рамёстваў і тэхнічных вырабаў. Назвы струмэнтаў, рэчаў і спосабаў вырабу (кросны, стузя, млын; алейніцтва, гутніцтва і г. д.).

16. Назвы земляробскіх работ, прылад і машын. Назвы спосабаў вырабу зямлі й сыстэм земляробства.

17. Назвы, якія ужываюцца пры паляваньні й рыбных ловах. Назвы прылад (пастка, таптуха, венцер, вуда і г. д.) і спосабаў паляўніцтва (аблава, засада і г. д.).

18. Назвы занятаў, зьвязаных з гадоўляй жывелы (малачарства, сьвінарства, пчалярства, канавальства, і г. д.).

19. Назвы што ужываюцца у лясной гаспадарцы.

20. Назвы прылад і матар'ялаў асьвятленьня і ацяпу.

21. Назвы, датычныя да вайны. Назвы відаў зброі (стрэльба, кулямет і г. д.). Назвы аддзелаў войска й вайсковых пасад.

22. Назвы, якімі азначаюцца шляхі зносін—сухаземныя й водныя. Назвы спосабаў і прылад язды, плаваньня і г. д.

23. Назвы, якія ужываюцца пры абмене й гандлі. Назвы месца гандлю (ірмаш, рынак, корма і г. д.). Назвы відаў гандлярства. Адзінкі мер. Назвы манэт.

24. Назвы для азначэньня пасяленьняў (горад, вёска, хутар, засьценак і г. д.). Назвы відаў вуліцы, плошчаў і г. д.).

25. Назвы сьвятаў. Назвы рэчаў забабонаў і культу (шаптуха, закляцьце, абраз, капліца, прошча і г. д.). Назвы, якія ужываюцца для азначэньня помнікаў мінуўшчыны (курган, ... і г. д.)

26. Назвы, якія ужываюцца пры вясельлі. Назвы вясельных абрадаў ды рэчаў. Назвы асоб, датычных да вясельля.

27. Назвы рэчаў ды абрадаў, якія ужываюцца пры радзінах і хрэсьбінах.

28. Назвы, якія ужываюцца пры пахаваньні. Назвы відаў сьмерці. Могілкі.

29. Назвы свяцтва й духоўцтва.

30. Назвы розных профэсій і заняткаў. Назвы ўлады і службовых асоб. Назвы грамадзкіх станаў (селянін, пан і г. д.).

31. Назвы юрыдычных паняцьцяў (сталічына, злачынства, забойства, крадзеж, вязень і г. д.).

32. Назвы рэчаў да гуляньня і вынаваньня. Назвы і гульні да пецікі. Назвы, што ужываюцца да школы і асьветных установ.

33. Назвы, датычныя да мэдыцыны й знахарства. Назвы хвароб і лекаў людзей і жывёлы.

34. Назвы году ды месяцаў. Назвы, якімі азначаецца падзел сутак.

35. Назвы, датычныя да вуснае народнае творчасьці, літаратуры й мастацтва (дояўлянае разьбярства, вышыўкі й тканіна, кераміка, музыка ды сьпевы, танцы ды гульні).

36. Назвы надзелаў і інш. частак зямлі, роднык уочышчаў, абгарожы і іх частак.

37. Меры зямлі і наогул меры: вагі, прастору і г. д.

38. Назвы упражы і яе частак.

39. Спосабы і спосаб пераноскі і таваньня.

40. Словы адносна розных хатніх прац.

41. Назвы колераў і іх адценьняў.

42. Політычны слоўнік мясцовага насельніка.

43. Новыя словы на вёсцы.

44. Прыметнікі, якія азначаюць розныя якасьці ці ўласьцівасьці прадметаў (напр., брыдкі, благі, добры і г. д.). Прыметнікі, якія ужываюцца для азначэньня колераў (блакітны, чырвоны, буравковы і г. д.).

45. Прыметнікі, якія ужываюцца для азначэньня прасторавых адносін, адносін сваяцтва, прывязі і інш. (напр., блізкі, далекі, родны, чужы і г. д.).

46. Створаныя ад такіх прыметнікаў прыслоўі.

47. Дзеясловы, якія азначаюць фізічныя і псыхічныя процэсы і дзеі людзей і жывёл (напр., хадзіць, дыхаць, мысьліць, крычаць і г. д.).

48. Дзеясловы, якія азначаюць зьмену стану прадметаў жывой і нежывой прыроды (напр., бальшэць, расьці, хварэць і г. д.)

49. Дзеясловы, якімі азначаюцца узаемаадносіны паміж людзьмі (напр., сябраваць, змагацца, кахаць, падлягаць і г. д.).

50. Дзеясловы безасабовага значэньня (напр., днее, сьвітае і г. д.).

51. Лічэбнікі й займеньнікі, калі яны з фонэтычнага або морфолёгічнага боку адрозьніваюцца ад прынятых у літаратурнай мове. Лічэбныя прыслоўі (напр., двойчы, тройчы і г. д.).

52. Прыйменьнікі у розных значэньнях з паказаньнем склону, якім яны кіруюць.

53. Злучнікі у розных значэньнях.

54. Выклічнікі, якія ужываюцца для выразу страху, гневу, радасьці, сьмутку, зьдзіўленьня і інш., а таксама гукапераймальныя словы (напр., «гаў», «гам», «бом-бім» і г. д.).

55. Спэцыяльныя выразы ды звароты, уласьцівыя беларускай мове (напр., «...дапь», «ушчаміць хвост», «уткнуць ...», «кудою» і г. д.).

56. Розныя роду дакукі, прыказкі, пажаданьні і г. д.,—як паасобныя словы і звароты і г. д.

57. Чужаземныя словы, паколькі яны набілі на сабе уплыву з боку беларускай мовы (напр., «стандаравацца», «камувіцтыя» і г. д.).

58. Наогул, чужаземныя словы, якія ходзяць сабе ужываньне у вузкіх профэсіях народу.

59. Асобна выпісваюцца: а) уласныя імёны людзей (поўныя і зьменшальныя ў ласкавым і зьневажальным сэнсе) і б) мянушкі жывёл і людзей.

60. Дзеясловы прыметнікі і інш. адпаведна разьдзелам 1—43.

Камісія і правы зьбіральнікаў

Усе запісы будуць скарыстаны для ўкладаньня Менскага Краёвага Слоўніка. У канцы збору будзе абвешчана хто колькі слоў сабраў. Тым, хто найбольш сабраў, будуць выданы прэміі. За спраўкамі і па матар'ялу зварачвацца па паказанаму вышэй адрасу.

Камісія для збору і выданьня слоўніка жывой мовы Меншчыны.

Дзесяты усебеларускі зьезд Комуністычнай партыі Беларусі.

ПОЛІТЫЧНАЯ СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б.

ДАКЛАД ТАВ. КРЫНІЦКАГА.

Будаўніцтва соцыялізму ва умовах БССР.

Бягучы пэрыод у міжнародным і ўнутраным становішчы нашага СССР характарызуецца коратка: 1) часовай частковай стабілізацыяй капіталізму; 2) пераходам ад задач аднаўленьня гаспадаркі да задач яе рэконструкцыі, яе соцыялістычнай перабудовы.

У бягучы пэрыод УсеКП(б) ва ўвесь рост паставіла перад сабою і ў Комінтэрне проблему будаўніцтва соцыялізму ў аднэй краіне. УсеКП(б) і ўсе іншыя комуністычныя партыі сьвету выказаліся па гэтаму пытаньню станоўча: будаўніцтва і пабудова соцыялізму ў аднэй краіне магчыма.

Чаму ўласна зараз гэта пытаньне стала перад нашай партыяй, перад пролетарыятам усяго сьвету, як актуальнейшае пытаньне? Чым гэта тлумачыцца? Партыя адказвае так: «Папершае, тым, што за апошнія гады прыпыніўся тэмп рэволюцыі ў іншых краінах, наступіла, так званая, „частковая стабілізацыя капіталізму“. Адгэтуль узросшая цікавасьць да пытаньня аб лёсе соцыялізму і соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Падругое, тым, што мы ўвялі НЭП, дапусьцілі прыватны капітал, і зрабілі некаторае адступленьне для таго, каб перагрупаваць сілы і пайсьці потым у наступленьне, адгэтуль пытаньне ці ня будзе ўвядзеньне НЭП'у да тамагаць «паслабленьню магчымасьцяй соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Патрэцяе... мы выйгралі грамадзянскую вайну... завяршылі пэрыод перадышкі, які даў спрыяючыя ўмовы для таго, каб ліквідаваць гаспадарчую разруху, аднавіць вытворчыя сілы краіны і заняцца будаўніцтвам новай экономікі ў нашай краіне... Адгэтуль пытаньне: калі весьці будаўніцтва ў бок соцыялізму, дык ці ёсьць падставы разьлічваць, што мы маем магчымасьць будаваць соцыялізм?

Адгэтуль вялізная цікавасьць усяе партыі і ўсяе рабочае клясы да пытаньня аб лёсе соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Адгэтуль штогодныя падлікі розных данных, якія праводзяць органы партыі і савецкай улады, з пункту гледжаньня ўзмацненьня ўдзельнае вагі соцыялістычных форм гаспадаркі ў галіне прамысловасьці, ў галіне гандлю і ў галіне земляробства». (Сталін).

Ня дзіва, што опозіцыя, соцыялдэмократычны ўхіл у нашай партыі зьявіліся ўласна зараз, у данны складаны пэрыод пераходу да задач соцыялістычнай рэконструкцыі ўсёй нашай экономікі. Гісторыя нашай партыі дае шэраг прыкладаў узьнікненьня опозіцыі супроць пролетарскае лініі партыі, хістаньняў сярод часткі партыі, нават адыход гэтае часткі ад вытрыманай бальшавіцкай лініі ў крытычныя складаныя пэрыоды рэволюцыйнага руху. Такія ваганьні і опозіцыйныя выступленьні мелі месца ў пэрыод перад Кастрычнікам, у рашучыя дні падрыхтоўкі і перамогі Кастрычніку. Гэта было ў дні калі вырашалася пытаньне аб Берасьцейскай згодзе. Гэта было ў сур'ёзны пэрыод перад Кранштадтам, калі партыя павінна была праверыць узаемаадносіны пролетарыята і сялянства і ўзяць лінію новай экономічнай політыкі. Гэта самае мы нагляд лі ў пэрыод 23 і 24 г. калі ў экономіцы нашае краіны стварыўся крызіс з прычыны пагрозы разрыву ўзаемаадносін між горадам і вёскай.

І зараз у пэрыод часовай частковай стабілізацыі капіталізму і пераходу да непасрэднага соцыялістычнага будаўніцтва, у пэрыод, калі патрэбна вялізная энэргія, рэволюцыйны размах ва ўсім штодзённым практычным будаўніцтве, калі партыя павінна больш, чым калі-б то ні было, быць на чале і цьвёрда весьці за сабою рабочую клясу і ўсіх працоўных па шляху далейшага ажыцьцяўленьня задач Кастрычнікавае рэволюцыі, цяпер, таксама зьяўляюцца такія, што хістаюцца, ныюць, ня вераць у сілы пролетарыяту, у магчымасьць пабудовы соцыялізму ў нашай краіне. Другімі словамі, у партыі зьяўляецца опозіцыйны блёк, соцыял-дэмократычны ўхіл.

Гэтаму ўхілу партыя дала рашучы адпор. „Ня гледзячы на асобы, партыя на чале і пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) выкрыла ўсю соцыялдэмократычную існасьць новай опозіцыі і ўся стала на абарону ленінскай лініі, актыўна ажыцьцяўляючы на справе вучэньне ленінізму. Партыя не замазвала і не захоўвала разгалосяў, хоць выкрыцьцё іх і выкінула з кіруючага штабу буйнейшых былых кіраўнікоў партыі. Політыка „сярэдняй“ прынцыповай лініі ня ёсьць наша політыка. Гісторыя нашай партыі ёсьць гісторыя перамогі ўнутраных супярэчнасьцяй і няўхільнага ўзмацненьня шэрагаў нашае партыі на аснове гэтае перамогі“. (Сталін).

І КП(б)Б разам з усёй партыяй цьвёрда, з поўным адзінствам, стаяла на правільнай ленінскай лініі пры ўсіх, быўшых за апошні год, спробах опозіцыі выступаць супроць партыі. Так было ва ўсіх бяз выключэньня нашых організацыях. Яны адхілялі малейшыя хістаньні адзінак у бок соцыял-дэмократычнага ўхілу. КП(б)Б вядзе ўсю працу пад сьцягам УсеКП(б) на якім напісана: „У нашай краіне есьць усё патрэбнае для пабудовы поўнае соцыялістычнае грамады“.

Задачу соцыялістычнага будаўніцтва КП(б)Б можа выконваць пры адзінай умове—далейшым узмацненьні непарыўнай сувязі БССР з СССР. Але, ва ўмовах Беларусі, нам, організацыі, якая працуе ў асабліва спэцыфічных умовах экономікі і гісторыі культурнага разьвіцьця, нам трэба было паставіць перад сабою пытаньне: якім чынам КП(б)Б павінна на практыцы ажыцьцяўляць цьвёрдую ленінскую лінію, як трэба разумець лёзунг будаўніцтва соцыялізму ва ўмовах БССР, ці усё ў нас досыць ясна і паленінску вытрымана ў пастаноўцы намі практычных пытаньняў будаўніцтва.

Задача будаўніцтва соцыялізму разьбіваецца ў БССР на цэлы шэраг агульных практычных задач: 1) ўзмацненьне соцыялістычных элемэнтаў экономікі БССР, як пераважна сялянскай рэспублікі; 2) узмацненьне дыктатуры пролетарыяту ў БССР, актывізацыя і ўзмацненьне кіруючай ролі рабочай клясы ў адносінах сялянства, усіх працоўных і інтэлігэнцыі ў прыватнасьці; 3) наклёпаваньне культурнага разьвіцьця БССР па пролетарскім шляху 4) ажыцьцяўленьне нацыянальнай політыкі партыі ў БССР як політыкі агульнага экономічнага і культурнага ўздыму раней занядбалага краю, адраджэньня Беларусі па соцыялістычным шляху, устанаўленьне братэрства і згоды паміж працоўнымі ўсіх нацыянальнасьцяй БССР; 5) бальшавізацыя КП(б)Б, як асноўнага ядра пролетарыяту, „настаўніка, кіраўніка і правадыра ўсіх працоўных у соцыялістычным будаўніцтве; 6) тым самым усё большае павялічэньне значэньня БССР, як прыкладу, што толькі дыктатура пролетарыяту, кіраўніцтва комуністычнай партыі і трываласьць СССР могуць забясьпечыць экономічны і культурны ўздым кожнай прыгнечанай пры капіталізьме нацыянальнасьці; 7) усё большае і далейшае ўзмацненьне сувязі БССР з саюзам працоўных усіх нацыянальнасьцяў БССР—з пролетарыятам і працоўнымі ўсяго СССР.

Экономічнае будаўніцтва.

XIV-ты зьезд УсеКП(б) перад ўсёй партыяй і краінаю паставіў як асноўную задачу—узмацненьне соцыялістычных элемэнтаў усяе гаспадаркі. Практычна гэта задача фармулявалася, як індустрыялізацыя краіны. Лёзунг індустрыялізацыі ў умовах БССР можа намі разглядацца так сказаць, з сялянскага боку. Мы не маглі ставіць перад сабою гэтага лёзунгу, як лёзунгу непасрэднага разьвіцьця ў БССР вырабу сродкаў вытворчасьці. Выходзячы з асноўнай задачы ўзмацненьня соцыялістычных элемэнтаў экономікі, узмацненьня дзяржаўнай прамысловасьці, перш за ўсё буйнай, і яе удзельнае вагі ва ўсёй гаспадарцы, мы ставілі перад сабою шэраг падсобных, адпавядаючых умовам БССР, задач. Задачы гэтыя наступныя: 1) разьвіцьцё прамысловасьці па перапрацоўцы мясцовага с.-г. сырцу і па дастаўцы ў вёску патрэбных с.-г. машын, прыладаў і г. д; 2) разьвіцьцё вытворчых сіл вёскі і мястэчка інтэнсіфікацыя сельскае гаспадаркі, разьвіцьцё саматужнай прамысловасьці; 3) экономічная дапамога беднаце; 4) коопэраваньне вёскі; 5) наогул—узмацненьне соцыялістычных элемэнтаў ў экономіцы

Аценьваючы гаспадарчыя вынікі за справаздачны пэрыод і намячаючы задачы, мы павінны памятаць аб асноўных труднасьцях бягучага пэрыоду: гэта прыпыненьне нашага гаспадарчага ўздыму ў параўнаньні з апошнімі гадамі аднаўленчага пэрыоду, пры агульным паглыбленьні і адносным узмацненьні соцыялістычных элемэнтаў экономікі.

Тав. КРЫНІЦКІ.

Гаспадарчае будаўніцтва—асяродак усёй працы КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б паставіў перад усімі партыйнымі організацыямі задачы гаспадарчага будаўніцтва, як асноўныя. Пад такім лёзунгам працавалі праз увесь справаздачны пэрыод і ЦК КПБ і партыйныя організацыі на мясцох. У працы ЦК КПБ, акруговых камітэтаў і невялікай часткі раённых камітэтаў мы здолелі дамагчыся ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу—паставіць у цэнтры ўвагі партыйных організацый пытаньні гаспадарчага будаўніцтва на месцы.

Але ў нашых ячэйках, у асноўнай вырашаючай нізавой сетцы нашай партыі, у значнай частцы раённых камітэтаў партыі гэтыя пытаньні ня сталі яшчэ ў цэнтры ўвагі: няма вучоту мясцовых экономічных магчымасьцяў, няма патрэбнага разуменьня мясцовых асаблівасьцяў і практычных задач гаспадарчага будаўніцтва.

Гаспадарчая праца КП(б)Б адбывалася, пераважна, у галіне ажыцьцяўленьня на справе практычных заданьняў, вызначаных красавіцкім пленумам ЦК КПБ аб якіх мы напомнілі ў жнівеньскім лісьце ЦК. Агульны напрамак гаспадарчага будаўніцтва мы імкнуліся перакласьці на мову практычнага ажыцьцяўленьня працы ва ўмовах раёну Гэта праца была гэткая: 1) „цьвёрдае праваджэньне рэжыму экономіі ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва; 2) мобілізацыя ўсіх унутраных рэсурсаў, сіл і сродкаў для павялічэньня продукцыйнасьці краю 3) павялічэньня спэцыяльных галін коопэрацыі і прадпрыемстваў па перапрацоўцы і апрацоўцы сельска-гас. прадуктаў; 4) павялічэньне організацыі мас навакол больш простых і даступных сялянству агрономічных мерапрыемстваў; 5) паскораньне працы па землеўпарадкаваньні шляхам пашырэньня дзяржаўных мерапрыемстваў, а таксама праз прыцягненьне сюды сродкаў і сіл сялянства; 6) пашырэньне засеваў карняплодаў і угнойных кармовых траў, як аснова разьвіцьця жывёлагадоўлі; 7) шырокае ўжываньне торфу ў якасьці ўгнаеньня; 8) ашчаднасьць лесу і ўжываньне торфу ў якасьці апалу; 9) шырокае разьвіцьцё прамысловага будаўніцтва ўсіх галін; 10) разьвіцьцё прамысловага будаўніцтва забясьпечвае павялічэньне інтэнсіфікацыі сельскай-гаспадаркі і больш моцнае коопэраваньне яе; 11) узмацненьне спажывецкай коопэрацыі і 12) праца па зьніжэньні розьнічных цэн“. (Ліст ЦК КПБ, жнівень 1926 году).

Навакол гэтых практычных задач разгортвалася ўся наша гаспадарчая праца на мясцох у кірунку агульнага напрамку соцыялістычных элемэнтаў.

Прамысловасьць.

Удзельная вага продукцыі дзяржаўнай прамысловасьці за 1923-26 г. г. павялічылася гэтак: 17,8 проц. 18,3 проц. 22,3 проц. у адносна агульнай продукцыі народнае гаспадаркі. Гэтыя абставіны (а таксама павялічэньне проценту коопэрацыі і дзяржаўнага гандлю ў тавараабароце а таксама рост проценту коопэраваньня сялянскіх гаспадарак) гавораць аб узмацненьні абагуленых элемэнтаў у экономіцы БССР.

За справаздачны пэрыод адзначаецца рост прамысловасьці: лік рабочых павялічыўся на 44 проц., продукцыя прамысловасьці ВСНГБ за 1925-26 г. павялічылася на 42,1 проц., уся цэнзавая прамысловасьць БССР па продукцыі павялічылася на 56,8 проц.

Мы таксама маем значнае прасоўваньне ўперад якасьці працы прамысловасьці: рацыяналізацыя вытворчасьці ў шэрагу падпрыемстваў, шэраг дасягненьняў па палепшаньню якасьці продукцыі.

Заработная плата за год павялічылася на 16 проц. (замест назначаных па пляну 10 проц.). Невыстарчаючае зьніжэньне розьнічных цэн зьменшыла гэта павялічэньне зарплаты толькі да 4 проц. у рэальным значэньні. Павялічаны асыгнаваньні на кватэрнае будаўніцтва па прамысловасьці да 450.000 замест 150.000 у 24-25 годзе; гэта ня лічачы адлічэньняў па фонду палепшаньня становішча рабочых.

У гэты самы час прамысловасьць за справаздачны пэрыод мае шэраг адмоўных момантаў. Гэта паніжэньне каэфіцыенту выкарыстоўваньня рабочага часу з 86,3 проц. да 85,8 проц. Наогул, прадукцыйнасьць працы за год паднялася толькі на 1 проц., у той час, як за 24 25 год—на 22 процанта. У гэтым зьявішчы адбіваецца прыток новых рабочых у прамысловасьці, а таксама пагоршаньне абсталяваньня. Такім чынам рост прамысловасьці БССР за год быў, галоўным чынам, «экстэнсыўным»,—рост продукцыі ішоў галоўным чынам за лік павялічэньня ліку рабочых, а не павялічэньня прадукцыйнасьці працы. Як відаць, у надыходзячым годзе, судзячы па кантрольных лічбах Дзяржаўнай Плянавай Камісіі, мы будзем мець значна меншы рост агульнага ліку рабочых і пры гэтым большы тэмп павялічэньня прадукцыйнасьці працы,—гэтым самым узмацненьне тэмпу соцыялістычнага накапленьня ў нашай прамысловасьці.

Да адмоўных зьявішч у прамысловасьці трэба аднесьці таксама рост адпускных цэн, што пераважна вызначаецца павышэньнем цэн на драўніну, якая па апалу складае 70 процантаў, а па сырцу—30 проц

Справаздачны год асабліва адзначыў большае паслабленьне асноўнага капіталу прамысловасьці, большую перагрузку яго ў шэрагу выпадкаў. Прамысловасьць БССР увайшла ўжо ў пэрыод новага будаўніцтва. Аб гэтым гавораць лічбы капітальных затрат за 23 26 г. г.: 1 300.000 р.,—2.100.000 р., 4.500.000 р. У 26 27 г. маркуюцца капітальныя ўклады да 7,5 мільёнаў руб. Характэрна, што ў гэтых затратах усё большы процант займае не капітальны рамонт, а праца па пашырэньню і рэканструкцыі, а таксама па пабудове новых прадпрыемстваў,—90 проц. усіх капітальных затрат у 26 27 г., пойдуць уласна па гэтай лініі.

Вопыт справаздачнага году ставіць перад КПБ дзьве асноўныя задачы па прамысловасьці на наступны год: 1) найбольш рацыянальна выкарыстаць тыя вялікія капітальныя ўклады, які намячаюцца, 2) падняць прадукцыйнасьць працы прамысловасьці.

ЦК КПБ за справаздачны пэрыод займаўся таксама пытаньнямі чыгуначнага транспарту, комунальнай гаспадаркі, шляхавага будаўніцтва, разьвіцьця мясцовай прамысловасьці. Па гэтых лініях ёсьць працэс узмацненьня; асабліва важна адзначыць працу, якая за год моцна разгарнулася па мясцовай прамысловасьці.

Сельская гаспадарка.

У сельскай гаспадарцы ідзе працэс уздыму. Калі гаварыць аб сялянскай гаспадарцы, так працэс уздыму ідзе па той лініі, аб якой гаварыў на апошнай конфэрэнцыі тав. Рыкаў. Гэта ёсьць агульны ўздым усіх груп гаспадаркі пры зьменшэньні гаспадарак, якія зусім ня маюць жывёлы, беспасеўных і малапасеўных. І ў БССР няма працэсу расслаеньня сялян у „чыста клясычным выглядзе“, калі сярэдзіна вымываецца за кошт бядняцкага пласту з аднаго боку і за кошт заможнага кулацкага з другога“. Сапраўды па даных ЦСУ БССР у групах па пасеву адбылося такое паменшэньне ў 24-25 г. параўнаўчы з 23-24 г.

Беспасеўныя	2,1	1,4	—0,7
ад 0,1 да 1,0 дзес.	7,8	6,8	—1,0
ад 1 да 2 0 дзес.	25,0	20,5	—4,5

Па астатніх групах, пачынаючы з 2,1 ідзе павышэньне, асабліва значнае ў характэрнай серадняцкай групе 4—6 дзес.

Па скаціне маецца паменшэньне груп бяз ўсякай скаціны, без працоўнай скаціны, з адной штукай працоўнай скаціны, рост па групах з 2 і больш штукамі працоўнай скаціны.

Гэты малюнак пад'ёму вёскі характарызуецца па даных адносна пахаты, пасеву і коняй. На 100 сялянскіх гаспадарак прыходзілася ў гады 1924 25-26 г.:

Пахаты дзес.	503,8	511,8	521,5
Пасеву дзес.	345,5	358 1	378,1
Коняй	119 1	131,5	132 8

Агульны ўздым у вёсцы грунтуецца перш за ўсё на шэрагу абставін аб'ектыўнага значэньня: павялічэньне сялянскага зямельнага фонду пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі, пасьля праваджэньня часткі працы ў БССР па землянадзяленьню, па перадачы дзяржаўнага і лясного фонду, зьніжэньне падатку параўнаўча з дарэволюцыйным пэрыодам, агульнае аднаўленьне гаспадаркі пасьля грамадзянскай вайны. Адзак, у гэтым уздыме ня малую ролю граюць організаваныя ўздзеяньні з боку пролетарскай дзяржавы.

КП(б)Б праводзіць працу па ўздыму сялянскай гаспадаркі па такіх лініях: 1) інтэнсыфікацыя сельскае гаспадаркі, пераход на шматпольле, разьвіцьцё тэхнічных культур і жывёлагадоўлі; узмацненьне агрыкультурнай працы і абслугоўваньне аградапамогаю насельніцтва; 2) разьвіцьцё землеўпарадкаваньня, праводзеньне землянадзяленьня малазямельных і безьзямельных груп, пашырэньне зямельнае плошчы праз мэліарацыю; 3) узмацненьне сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту; 4 разьвіцьцё торфарасправовак і агнятрывалага будаўніцтва; 5) узмацненьне і разьвіцьцё лясное гаспадаркі; 6) аграномічная дапамога беднаце.

Па ўсіх гэтых лініях ёсьць значны рост, я карыстаюся лічбамі „Матэр'ялы да справаздачы ЦК і дакладу па гаспадарчым будаўніцтве. Лічу патрэбным спыніцца на пытаньні аб дапамозе беднаце і пытаньні аб фінансаваньні працы па сельскай гаспадарцы.

За 1925-26 г. эканамічная дапамога беднаце вымяраецца значнымі лічбамі. Гэта—30 проц. льготнага землеўпарадкаваньня сялян, якое абхапіла каля 9.000 гаспадарак. Гэта ёсьць крэдытаваньне землеўпарадкаваных, больш слабых гаспадарак, пры гэтым доўгатэрміновы крэдыт па гэтай лініі за справаздачны год складае 700 тыс. руб. У справаздачным годзе створан фонд дапамогі беднаце ў 500 тыс. руб. па БССР, гэты-ж фонд унесен у бюджэт 1926-27 г. Праведзена праца па землянадзяленьню беднаты на 10 проц. больш леташняй. Праведзена крэдытаваньне беднаты лесам на 260 тыс. руб. (замест леташніх 152 тыс. руб.). ёсьць шэраг дасягненьняў па коопэраваньню беднаты.

Вось тая новая праца, праведзеная КП(б)Б, якая дапамагае таму, каб замест працэсу абядненьня, прогрэсуючага пагоршаньня становішча ніжэйшых груп вёскі, дабіцца ўздыму усіх, у тым ліку і бяднейшых сялянскіх гаспадарак. Гэта праца асабліва вялікая па свайму значэньню ў БССР, дзе вялікі процант адносная перанаселенасьці вёскі і дзе вялізнае значэньне набывае справа ўзмацненьня бядняцкай гаспадаркі па шляху коопэраваньня.

Пытаньне аб фінансаваньні працы па сельскай гаспадарцы павінна прыцягнуць да сябе вялізную ўвагу усіх партыйных організацый. Дзяржава, галоўным чынам, праз апарат НКЗема, укладвае вялізныя сродкі ў сельскую гаспадарку. Гэтыя сродкі павялічыліся ў справаздачным годзе, прычым на 1926-27 г. намячаецца павялічэньне на 20 проц. і павялічэньне ў тры разы ў параўнаньні з 1924-25 г. У прыватнасьці, па лініі агрономіі заўважваецца рост на 112 проц.—з 256 тыс. да 544 тыс. руб. Такія працы, як вопытна дасьледчыя ўстановы, пракатныя пункты, рассаднікі і пітомнікі і г. д. павялічваюцца ў асыгнаваньнях на 75 проц. і больш.

Калі прыглядзецца да працы нізавой сеткі апарату НКЗему, дык незаўсёды можна сказаць, што НКЗем так кіруе апаратам, што сродкі, якія ўкладвае пролетарская дзяржава ў сельскую гаспадарку, сапраўды дапамагаюць разьвіцьцю яе па соцыялістычным шляху, узмацняюць абагуленьне сялянскай гаспадаркі. Цікава, што, калі ЦК дабіваўся ад НКЗему і іншых органаў даных, хоць бы прыблізных, якія сьведчылі-б аб тым, як трацяцца вялікія сродкі па НКЗему, г. зн., якія працэсы ў вёсцы і ў якой форме фінансуе савецкая дзяржава, мы адказу на гэта пытаньне атрымаць не здолелі. Гэтае пытаньне непасрэдна ў Наркамземе ня ўзьнімаліся. Яно ўзьнімаецца намі толькі цяпер, калі патрэбна зусім выразнае зразуменьне таго, куды трацяцца сродкі, у якой меры яны дапамагаюць агульнаму ўздыму вытворчых сіл вёскі, ўздыму індывідуальных дробных гаспадарак і асабліва, у якой меры гэтыя сродкі павялічваюць процэс абагуленьня вёскі. Іншымі словамі, у якой меры земляўпарадкавацель, агроном, загадчык пракатнага пункту і г. д. на справе праводзяць клясавы напрамак у вёсцы ў адносінах беднаты і агульны напрамак коопэраваньня вёскі.

На аснове практыкі справаздачнага году перад КП(б)Б у галіне народнае гаспадаркі будуць стаяць такія задачы на будучы час: 1) агульны ўздым продукцыйных сіл вёскі; 2) падцягваньне бядняцкіх гаспадарак; 2) павялічэньне працы НКЗему, коопэрацыі і іншых установ па коопэраваньню вёскі; 4) уважлівая праверка, асабліва ў акруговай нізавой сетцы, рацыянальнага выкарыстаньня вялікіх сродкаў, якія выдаюцца дзяржаваю на сельскую гаспадарку; 5) узмацненьне лясной гаспадаркі.

Коопэрацыя.

Спажывецкая коопэрацыя падыходзіць да поўнага выкананьня програмы коопэраваньня вёскі. На 1-е студзеня 1927 г. яна налічвае каля 40 проц. коопэраваных сялянскіх гаспадарак. Мы маем далейшы рост працы спажывецкай коопэрацыі, пашырэньне яе операцыйнае працы, фінансавага становішча ва ўсёй сыстэме і, асабліва, у нізавой сетцы.

Па лініі сельска-гаспадарчай коопэрацыі таксама наглядваецца рост, прычым процант коопэраваньня за год, к ліпеню 1926 г. павялічыўся з 17,5 да 22,9 проц. У працы сельска-гаспадарчай коопэрацыі зна на больш цяжкасьцяй і недахватаў. Пры агульным яе росьце ўсё ж ёсьць значныя фінансавыя труднасьці ў сыстэме, мала палепшана опэрацыйная праца, ёсьць шэраг коопэратываў і саюзаў, якія працуюць з дэфіцытам. Асабліва трэба адзначыць, што сельска гаспадарчая коопэрацыя да гэтага часу ня зусім справілася з задачай праведзеньня клясавай лініі па абслугоўваньню розных социяльных груп вёскі. У большасьці выпадкаў каэфіцыэнт удзелу розных социяльных груп вёскі ў коопэрацыі павялічваецца ў бок больш моцных гаспадарак; напрыклад, па пасеву, коэфіцыэнт удзелу павышаецца так;

Без пасеву	5,0
Да 2 дзес.	0,59
Ад 2 да 4 дзес. . .	0,5
Ад 4 да 6 дзес. . .	1,6
Ад 6 да 8 дзес. . .	2,3

Па забесьпячэньню рабочай жывёлай, гэты коэфіцыэнт удзелу таксама зьмяняецца:

Без рабочае жывёлы	0,45
З 1-м канём	0,65
З 2-мя коньмі . . .	2,90
З 3-мя „	4 10

Агульны надзвычайна важны вывад: партыя яшчэ не дабілася праз сельска-гаспадарчую коопэрацыю больш шырокага коопэраваньня маламоцных гаспадарак.

У росьце с-г. коопэрацыі, асабліва вызначаецца рост малочнай коопэрацыі, машыннай, мэліорацыйнай і крэдытных сельска-гаспадарчых таварыстваў. Відочна ўмовы БССР падказваюць толькі такі шлях коопэраваньня вёскі па гэтых відах коопэрацыі.

Вопыт мінулага году прымушае нас паставіць перад сабою пытаньне аб конкрэтных шляхох коопэраваньня вёскі БССР. У нашай партыі „хадзячай думкай», зьяўляецца думка аб тым, што трактар зьяўляецца асноўным калектывізуючым фактарам у вёсцы. Гэта правільна ў адносінах многіх раёнаў Саюзу з шырока разьвітай зернавой гаспадаркай, вялікім зямельным прасторам. У Беларусі, пры яе вялікім малазямельлі і ўмовах глебы, трактар у бліжэйшы час, як відаць, не можа заняць рашаючага значэньня ў якасьці калектывізуючага фактара. Вопыт падказвае, што асноўная праца па коопэраваньню вёскі пойдзе па шляху перапрацоўкі с.-г. продукцыі. Я запытаў найбольш аўтарытэтных таварышоў з коопэрацыйных і гаспадарчых органаў БССР аб гэтым пытаньні. І думкі ўсіх сходзяцца на тым, што асноўнымі формамі с.-г. коопэрацыі ў БССР трэба прызнаць малочную, машынную, мэліорацыйную коопэрацыю і крэдытныя сельска гаспадарчыя таварыствы.

Гэтыя чатыры віды с. г. коопэрацыі мы павінны разьвіваць і ўзмацняць. У некаторых раёнах, як напр. у Віцебшчыне, мы будзем разьвіваць і іншыя спэцыяльныя віды с. г. коопэрацыі, як разьвядзеньне лёну і г. д.

Гэта пытаньне аб канкрэтных шляхох коопэраваньня вёскі мае вялізнае політычнае і практычнае значэньне таму, што толькі яго вырашэньне можа даць вясковаму працаўніку і селяніну выразны жыцьцёвы адказ на тое, як павінна разьвівацца соцыялістычнае будаўніцтва ў вёсцы.

На наступны год адносна коопэрацыі мы павінны выдзеліць такія задачы: 1) далейшае ўцягваньне беднаты ніжэйшых груп сялянства у коопэрацыю, асабліва сельска гаспадарчую; 2) паглыбленьне працы с.-г. коопэрацыі па лініі коопэраваньня вытворчасьці і ўзмацненьня элемэнтаў абагуленьня вёскі; 3) пашырэньне, галоўным чынам, тых відаў с.-г. коопэрацыі, якія найбольш адпавядаюць умовам БССР, стварэньне для гэтых відаў коопэрацыі пераважных умоў працы; 4) павялічэньне грамадзкага і політычнага значэньня коопэрацыі.

За справаздачны год на аснове росту нізавое сеткі організаваліся беларускі і акруговыя цэнтры саматужна-прамысловай коопэрацыі. Вопыт працы гэтага віду коопэрацыі паказвае, што праблема гаспадарчага крызісу ў мястэчку ў большай частцы вырашаецца правільным разьвіцьцём саматужна-прамысловай коопэрацыі.

Таваразварот

За справаздачны пэрыод адзначаецца агульны рост таварных зварот на рынку БССР таварных мас, прыкладна, на 85 проц. Пры гэтым узрастае значэньне коопэрацыі і дзярж гандлю ва ўсім таваразвароце. За гады 1923-1926 коопэрацыя займае ў пасрэдніцкім звароце 26,3 пр.—39,1 пр.—46,6 проц; гэты рост адбываецца за кошт прыватнага гандлю, які зьменшыўся з 53,8 да 31,4 проц.

Выцясьненьне прыватнага гандляра з пасрэдніцкага гандлю адбываецца за кошт яго выцясьненьня, галоўным чынам, з гандлю па прамысловых таварах. Па сельска-гаспадарчых таварах прыватны гандляр займае дамінуючае становішча — у 1924 1925 годзе 81 процант у гандлі сельска-гаспадарчымі таварамі. Тое самае дамінуючае становішча прыватны гандляр займае ў опэрацыях па дастаўцы і збыту саматужніцкай прамысловасьці.

Праца па зьніжэньню розьнічных цэн, пачынаючы мая месяца, актыўна разгорталася. Па лініі прамысловых тавараў гэта зьніжэньне дасягала 1,5—5 з паловай проц., прычым паасобных коопэратывах зьніжэньне даходзіла да 14 15 проц. Па лініі дзяржаўнага апарату і кіруючых органаў коопэрацыі была праароблена значная праца (дырэктывы, праверка, аддача пад суд коопэратываў і дзяржаўных органаў, якія ня выконвалі дырэктывы і інш.). Аднак, трэба прызнаць, што уся гэта праца яшчэ толькі распачата; дасягненьняў зусім мала.

У падыходзячым годзе па лініі таваразвароту стаяць перад КПБ задачы: 1) далейшае зьніжэньне розьнічных цэн, 2) далейшы абхоп бюджэту спажыўцоў вясковай і рабочай спажывецкай коопэрацыяй, 3) выцясьненьне прыватнага гандляра з гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі і опэрацый з саматужнікамі.

Рэжым экономіі

Кампанія па рэжыму экономіі была разгорнута выстарчаюча на шмат якіх нарадах гаспадарчых організацый, у друку, у працы цэнтральных і акруговых установ. Маецца шэраг дасягненьняў у сэнсе спрашчэньня гаспадарчых і савецкіх апаратаў, зьніжэньня адміністрацыйных выдаткаў. У агульным праца знаходзіцца яшчэ ў першай стадыі, шырокія масы рабочых і сялян у яе ня ўцягнуты.

Бюджэт

Пытаньні бюджэту мы павінны разглядаць з пункту гледжаньня, ці фінансуюцца ў здавальняючай меры тыя галіны, якія партыя вызначае перад краінай, як рашаючыя ў сэнсе экономічнага разьвіцьця культурнага будаўніцтва і г. д. З гэтага пункту погляду бюджэт БССР адпавядае асноўным пастановам: павялічэньне бюджэту адбываецца якраз па тых стацьцях, якія адказваюць рашаючым экономічным задачам. Па бюджэту 26-27 г. асыгнаваньне па лініі прамысловасьці павялічваецца на 31 проц. у параўнаньні з 1924 25 г.; гэта—павялічэньне ў 8 разоў. На мясцовую прамысловасьць упяршыню адпускаецца каля паўтара мільёна ў фонд па фінансаваньню мясцовае прамысловасьці, у той час, як у папярэднія гады адпускалася 624 000 і 685 000 р. Перад саюзнымі органамі пастаўлена пытаньне аб водпуску сродкаў на пачатак прац для пабудовы Асінаўскай раённай электростанцыі 840.000 р. На сельскую гаспадарку асыгнаваньне павялічваецца на 20 проц., па дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэту яно раўняецца (бяз Гомеля і Рэчыцы) —12 490.000 р. Фонд беднаты захоўваецца ў разьмеры 500 000 р. У асноўны капітал Белсельбанку намячаецца 1.400.000 р. проці 680.000 руб. у мінулым годзе. Мяркуюць асыгнаваць на ўзмацненьне нізавой сеткі спажывецкай коопэрацыі 150.000 р. сельска-гаспадарчай коопэрацыі 400 тыс. руб., саматужніцка-прамысловай коопэрацыі 200 000 р.

Такім чынам, усе важнейшыя чарговыя гаспадарчыя задачы фінансуюцца ў межах бюджэтных магчымасьцяў, высоўваюцца на першае месца.

У выніку справаздачнага году мы можам прызнаць, што гаспадарчы рост БССР ідзе наперад, усё больш павялічваецца ўдзельнае значэньне соцыялістычных элемэнтаў у нашай экономіцы, па гаспадарчай лініі ідзе „соцыялістычнае адраджэньне" Беларусі.

Але мы яшчэ не навучыліся даволі поўна і рацыянальна выкарыстоўваць усе магчымасьці і сродкі, якія пролетарская дзяржава мае для гаспадарчых патрэб. З гэтага пункту гледжаньня неабходны сур'ёзны перагляд усёй нашай сыстэмы працы ў галіне гаспадаркі і паглыбленьня яе.

Пытаньні політычнага становішча

Становішча у шэрагах рабочае клясы

На глебе агульнага гаспадарчага росту БССР, мы адзначаем далейшае ўмацаваньне політычнага становішча партыі і савецкай улады ў шэрагах рабочае клясы, сялянства, інтэлігенцыі і ўсіх працоўных.

Пытаньне аб становішчы ў шэрагах рабочае клясы мае для нас рашаючую важнасьць. Уласна, ва ўмовах БССР, сялянскай па пераважнасьці рэспублікі, вялікае значэньне мае колькаснасьць, актыўнасьць, сьвядомасьць пролетарыяту, што забясьпечвае правільную пролетарскую лінію працы савецкай улады і партыі.

Наогул, мы маем значнае ўмацаваньне пазіцый партыі за год па гэтай лініі.

Трэба, раней усяго, аднак, адзначыць дзьве новыя цяжкасьці, якія стаяць перад намі. Першая—абумоўлена значным ростам пролетарыяту БССР за лік новага пласту рабочых: за 2 апошнія гады лік рабочых у прамысловасьці БССР павялічыўся ўдвойчы і за апошні год на—44 проц. Другая цяжкасьць — гэта прыпыненьне тэмпу росту заработнай платы параўнаўча з ростам у папярэднія гады, калі жыцьцёвы ўзровень рабочага яшчэ вельмі адставаў ад даваеннага ўзроўню.

Адносна новага пласту рабочых мы маем даныя па 9-ці буйнейшых прадпрыемствах, галоўным чынам Віцебскай і Барысаўскай акруг. На гэтых прадпрыемствах налічваецца 5500 рабочых, прынята новых рабочых за апошні год 2600, г. зн. рост раўняецца—47 проц. З каго складаецца гэты новы пласт, іншымі словамі, ці зьмяняецца і як зьмяняецца склад пралетарыяту БССР? У склад новых рабочых уваходзяць:

Быўшых рабочых . . .	50 6 проц.
Дзяцей рабочых . . .	21,9 „
Парабкі і с.-г. раб. . .	18,4 „
Сяляне, зьвязаныя з с.-г.	11,2 проц.
Саматужнікі	2,9 „

Такім чынам быўшыя рабочыя і дзеці рабочых даюць у новым пласьце рабочых за апошні год 72 проц.; сяляне і саматужнікі, г. зн. рабочыя, вышаўшыя з дробнае гаспадаркі непасрэдна,—28 проц.

Неабходна ўважліва аднесьціся да тэй часткі новых рабочых, якія адносяцца да быўшых рабочых. Нельга сказаць, што гэта частка новых рабочых зьяўляецца сапраўдна пролетарскай, якая прайшла раней добрую школу фабрыкі і заводу, захаваўшая гэту школу, якая прынесла цяпер на прадпрыемства ясную клясавую сьвядомасьць. Мы ведаем, што ня толькі па Беларусі, але таксама і ў іншых раёнах Саюзу, сярод гэтае часткі рабочых шмат тых, якія ў пэрыяд грамадзянскай вайны і гаспадарчай разрухі ня вытрымалі ўсіх цяжкасьцяй працы ў прамысловасьці, у існуючых тады ўмовах, ушлі ад прамысловасьці, на вёску, часам на рамясьніцкія промыслы.

Значную частку гэткіх рабочых неабходна аднесьці да пласту дэклясаваных рабочых; гэту частку нельга параўнаць з рабочымі, якія стаяць на ўзроўні высокай клясавай сьвядомасьці. Гэтыя рабочыя прыносяць цяпер на прадпрыемствы тыя-ж пролетарскія настроі, як і зусім новы пласт рабочых з вёскі, ці саматужнікаў якія толькі цяпер адарваліся ад дробнай гаспадаркі. Сапраўды, калі мы прыглядзімся да лічбаў уступленьня ў партыю з ліку новых рабочых, то мы ўбачым, што процант уступленьня ў партыю з ліку рабочых, быўшых раней рабочымі, менш параўнаўча з процантам уступленьня ў партыю іншых катэгорый новых рабочых (сельска-гаспадарчыя рабочыя, парабкі, сяляне).

Іншымі словамі, у новым пласту рабочых, які прышоў цяпер у вялікай колькасьці на нашы прадпрыемствы, ёсьць значная частка, якая прышла з клясавай сьвядомасьцю больш ніжэй, чымся ў сярэдняга старога рабочага прадпрыемства.

Дасьледваньне адзначае шэраг вельмі характэрных зьявішч у новым пласту рабочых. Яшчэ добра не ўсьвядомлена роля і значэньне профсаюзу, як школы комунізму, як клясавай арганізацыі пролетарыяту; няма клясавай блізкасьці да профсаюзу; адчуваецца часта, што патрэбен толькі профэсыянальны білет. Політычны ўзровень новых рабочых слабы. Адзначаецца нездавальняючая спайка новых і старых рабочых. Новыя рабочыя прыносяць вельмі часта з сабой няўважлівыя «не гаспадарчыя" адносіны да вытворчасьці. Адзначаецца больш моцная тэндэнцыя да „параўнаньня" сярод новых рабочых, куды больш моцная, чым сярод старых. Як правіла, роля рабочае клясы кіраўніка, гегемона ў нашай краіне ўсьвядомлена зусім не здавальняюча.

У сэнсе прадукцыйнасьці працы новы пласт рабочых прынёс значны скок уніз. Па гэтаму пытаньню ёсьць цікавыя даныя па заводу «Чырвоная Бярэзіна". У другой зьмене па гэтаму заводу згуртаваны толькі новыя рабочыя. З кастрычніка 1925 году па жнівень 1926 году прадукцыйнасьць на кожнага рабочага ў скрынках за дзень зьмянялася такім чынам (з дапаўненьнем): 0.77—0,82—0.84—0,89—0 94—092—0,92,—0,94—1,02,—1,01—1,02—1,01 (для старых рабочых норма гэты пэрыод не спускалася ніжэй 0,99 і нават дасягала да 1,34).

Значыцца, на працягу году новы пласт рабочых уцягнуўся ў вытворчасьць, узьняў сваю прадукцыйнасьць. У гэтым сэнсе за год новы пласт рабоч. прайшоў ужо некаторую школу на прадпрыемстве; нязначны рост прадукцыйнасьці працы ў справаздачным годзе знаходзіць сваё поўнае тлумачэньне ў прыведзеным шэрагу лічбаў несамнена, надыходзячы год будзе больш спрыяючым у гэтых адносінах.

Бясспрэчна таксама, што і па лініі актыўнасьці, політычнай сьвядомасьці, уцягваньня ў працу новых рабочых у наступны год мы таксама будзем мець рост.

Наогул—вялізны прыцёк новых рабочых у прамысловасьць БССР значна ўзмацняе пролетарскую базу БССР. Але трэба адзначыць яшчэ нашу зусім недахватную працу сярод нізавога пласту рабочых. Гэта група новых рабочых часта выходзіць з поля ўвагі партыйных і профэсіянальных організацый і павольна ўцягваецца ва ўсю працу. Характэрна прыклад: на заводах „Мэтпром" і „Камінтэрн" сярод членаў і кандыдатаў у гарсавет мы ня бачым ні аднаго з новых рабочых; тое самае адносна складу новага фабзавкому. Напрыклад, на прадпрыемствах ня было праведзена ніводнага сходу з новымі рабочымі, сярод якіх не праведзена ні якая дадатковая выхаваўчая праца.

Трэба адзначыць, што ў справаздачным пэрыодзе і ў наступным годзе значны „дэклясуючы" ўплыў мае і будзе мець беспрацоўе. Лік беспрацоўных на жнівень 1925 г. складае 20.400, у сьнежні 1926 г.—21776. Пры гэтым процант кваліфікаваных рабочых зьменшыўся сярод беспрацоўных да 18 проц. Процант беспрацоўных, што прышлі з вёскі, павялічваецца. Найбольшая група беспрацоўных з вёскі, якая мае тэндэнцыю і далей расьці, значна ўплывае і націскае на рабочых, галоўным чынам, цераз новы пласт рабочых.

У Беларусі мы павінны былі разгарнуць значную працу дапамогі беспрацоўным: пашыраны і павялічаны грамадзкія працы, пашырана сетка працоўных колектываў, павялічана грашовая дапамога; на наступны год у бюджэт уключаецца сума больш аднаго мільёну руб. На гэта пытаньне ўсе партыйныя організацыі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу. Зразумела, сур'ёзнае і кардынальнае вырашэньне проблемы беспрацоўя будзе пастулова пераходзіць у меру агульнага гаспадарчага росту, павялічэньня інтэнсыўнасьці і працаёмкасьці сельскай гаспадаркі, тым самым спыненьня адноснага перанасяленьня вёскі, разьвіцьця саматужнай прамысловасьці і коопэрацыі, роста мясцовай і дзяржаўнай прамысловасьці.

Больш павольнае, чым у папярэднія гады, палепшаньне матар'яльнага становішча рабочых у справаздачным годзе, таксама крыху перашкаджала далейшаму павышэньню актыўнасьці рабочых і нашай працы на прадпрыемствах, галоўным чынам, у адносінах нізка аплачваемых катэгорый рабочых. Сярэдняя рэальная заработная плата рабочых у дзень у 24 25 г. была 88 к. і ў 1925-26 г.—94 к. з некаторай тэндэнцыяй павялічэньня, пачынаючы з другога кварталу. Гэтага павялічэньня недахватна. Яно абумоўлена нашай недахватнай працай па зьніжэньню розьнічных цэн. З другога боку, яно не магло быць больш значным, паколькі ўся лінія пролетарыяту нашай краіны ў справаздачным годзе, годзе вялікіх гаспадарчых труднасьцяй, (вясна 1926 г.) зводзілася да таго, што павялічэньне заработнае платы магчыма толькі на аснове далейшага павялічэньня прадукцыйнасьці працы.

У наступным годзе прынята павялічэньне сярэдняй заработнай платы г. зн. фонду зарплаты, ня менш, як на 7 проц. з тым, каб гэта павялічэньне дакранулася і ніжэйшых пластоў рабочых, для якіх гэта сярэдняе павялічэньне выйдзе, прыкладна, у 12 проц. З другога боку, у надыходзячым годзе на аснове леташняга вопыту, профсаюзы, партыя і савецкія органы павінны разьвіваць вялікую працу па зьніжэньню розьнічных цэн, што ў сваю чаргу будзе дапамагаць павялічэньню рэальнай заработнай платы.

Пры ўсіх гэтых цяжкасьцях у цэлым, мы маем станоўчыя вынікі політычнага становішча сярод рабочых за год. Гэта—колькасны рост рабочых БССР, уключэньне ў БССР каля 20 тысяч новых прамысловых рабочых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, што значна ўзмацняе пролетарскую базу БССР.

Мы маем агульны рост актыўнасьці рабочых, аб чым сьведчыць прысутнасьць рабочых на сходах, перавыбарных і чарговых, удзел у спрэчках на сходах і зьездах, значнае павялічэньне актыўнасьці пры вылучэньні кандыдатур на кіруючую працу. Адзначаецца вялікі рост актыву профсаюзаў, у прыватнасьці павялічэньне ліку сяброў профсаюзаў, уцягнутых у працу вытворчых нарадаў і экономічных камісій.

Мы маем таксама агульнае ўмацаваньне профсаюзаў, рост іх аўтарытэту, сувязі з рабочымі на мясцох, паглыбленьне працы профсаюзаў на прадпрыемствах.

(Працяг будзе).

Перавыбары сельсаветаў.

Комсамольскія ячэйкі прымаюць актыўны удзел у падрыхтоўчай кампаніі

Дзе працаздольны сельсавет— там сяляне вылазяць з цемнаты і беднасьці.

(Калодзецкі сельсавет, Чэрвеньскага раёну, Меншчына).

У прэзыдыум сельсавету ранейшага складу было абрана 3 комсамольцы з якіх—адна дзяўчына.

Да сучасных перавыбараў мы маем у працы свайго сельсавету вялікія дасягненьні.

У 1926 ым годзе ў вёсцы Калодзезі праведзена землеўпарадкаваньне 158 двароў. Організавана 16 пасёлкаў і 6 хутароў. К будучаму 1927 году праведзена падрыхтоўчая праца да землеўпарадкаваньня яшчэ 107 гаспадарак.

Восеньню гэтага году адчынілі ў вёсцы Пляціўішча новую школу, дзе вучыцца 44 вучні, якім да гэтага часу ня было дзе вучыцца. Адчынена вячэрняя школа рабоча-сялянскай моладзі у якой вучыцца 48 чалавек.

Організаваны сельска-гаспадарчыя курсы на якіх вучацца 42 чалавекі, як лепш гаспадарыць.

Сяляне ў вёсцы Калодзезі сваімі сіламі збудавалі дзеля пажарнай дружыны добры хлеў.

Коопэрацыя працуе добра. Налічваецца 504 пайшчыкі, коопэрацыйная крама лічыцца першай па ўсяму раёну.

Камітэтам сялянскай узаемадапамогі ў час пасяўных кампаній было раздадзена беднаце 205 пудоў насеньня і 49 руб. грашыма.

У працы сельсавету комсамольцы прымаюць актыўны ўдзел.

Па ўсяму сельсавету праведзена ўжо справаздачная кампанія і сяляне з радасьцю адзначаюць дасягненьні ў працы сельсавету, даюць наказы ў далейшай працы.

Алесь Стаськевіч.

Комсамольцы ажывілі працу.

(Шапілаўскі сельсавет, Жлобінскі р., Барысаўская акруга).

У нашым сельсавеце працуе 5 комсамольцаў. Яны вельмі акуратна наведваюць усе пасяджэньні камісій, у якіх працуюць, сумленна выконваюць ускладзеныя на іх абавязкі.

Дзякуючы гэтаму сама праца сельсавету пачала ажыўляцца, а ўтрытэтнасьць комсамольцаў павялічваецца.

У сельсавеце зараз ёсьць моцная дабраахвотная пажарная дружына, коопэратыў, які налічвае 327 пайшчыкаў, выпісваецца да 100 экзэмпляраў розных газэт.

Новы вяскор.

Выбярэм беднякоў і комсамольцаў.

(Путчынскі сельсавет, Койданаўскі р., Меншчына)

Справаздачная кампанія аб працы сельсавету і КСУ ва нашым сельсавеце ўжо заканчваецца.

Сяляне прызналі працу камітэту сялянскай ўзаемадапамогі здавальняючай і ад-началі, што гэта „дзякуючы комсамольцам".

Праца сельсавету прызнанам слабай, бо ў ёй было шэраг недахопаў, старшыня і сакратар—вялікія п'яніцы.

Паглядзеўшы на гэта, сяляне ў адзін голас сказалі, што ў новы сельсавет трэба будзе выбраць беднякоў, камуністаў і комсамольцаў. Тады праца будзе наладжана добра.

Бедната нашага сельсавету ў гэтым годзе чакае перавыбараў надзвычайна згуртавана.

Кастусь.

Падрыхтаваліся!

(Рудзенская ячэйка ЛКСМБ, Меншчына).

У падрыхтоўцы да перавыбараў сельсавету наша ячэйка прыняла шчыры ўдзел.

На агульным сходзе ячэйкі былі заслуханы справаздачы комсамольцаў сяброў сельсавету. Гэтак сама прапрацавана пытаньне аб згуртаваньні беднаты і батракоў.

Да кожнай вёскі прымацаваны больш моцныя комсамольцы для правядзеньня справаздачных сходаў.

Ячэйкай выпушчана насьценная газэта, прысьвечаная перавыбарам сельсавету. У ёй высьвятляюцца ўсе добрыя і благія бакі Рудзенскага сельсавету.

Я. Бараві.

Моладзь на выбарах будзе згуртавана.

(Жыліхоўскі сельсавет, Слуцкае акругі).

У нас ужо перавыбары распачаліся згодна каляндарнага раскладу РВК 4 студзеня—першы дзень выбараў па нашаму сельсавету. У раёне мы выступілі першымі.

Зараз мы яшчэ заняты прадвыбарчай працаю. Комсамольцы ва ўсім дапамагаюць сельсавету.

Сьпісы асоб пазбаўленых права выбіраць—выклеены. Позвы выбіральнікам за адзін дзень былі падрыхтаваны і разданы.

1 і 2 студзеня праводзіліся сходы беднаты.

31 сьнежня правялі пробны прадвыбарчы сход бядняцка серадняцкай моладзі ў вёс. Выгодзе. Сход гэты прашоў надта ажыўлённа. Уся выкліканая павесткамі моладзь зьявілася. Вызначылі ў кандыдатуры новага сельсавету комсамольцаў.

— Выступаць на выбарах організавана правясьці вызначаных таварышоў, вось кароткая пастанова сходу.

М. Шпілеўскі.

Дзе самадзейнасьць—там праца!..

Як абслугоўваецца досуг рабочай моладзі комсамольскімі клюбамі і юнсэкцыямі?

Працуе, і добра працуе.

(Бешанкавічы, комсамольскі клюб).

За сем гадоў існаваньня нашай Бешанкавіцкай організацыі ЛКСМБ, яшчэ ніколі ня было таго парадку і той працы, якая праводзіцца сёлета ў нашым комсамольскім клюбе.

Напершае, як толькі закончыўся рамонт клюбу, мы выпісалі газэт і часопісаў, набылі шашкі і шахматы. Дзяжурства ўстаноўлена і па чытальні і па клюбу. Клюб адчынены штодня з 6 да 10 гадзін вечару. Праводзім вечары самадзейнасьці і лекцыі на якіх прысутнічае і беспартыйная працоўная моладзь мястэчка і акаляючых вёсак. Моладзь чытае газэты і кніжкі, гуляе ў шашкі і шахматы. Па ініцыятыве клюбнай камісіі організаваны гурток радыё-прыхільнікаў, які распачаў працу па установцы прыёмніка.

Усе вышэй адзначаныя моманты культурна-масавай працы комсамольскага клюбу далі здаровы ўзрост нашага саюзу за лік рабочай і сялянскай моладзі.

Ю—н.

Моладзь гуляе ў шашкі, шахматы..

Ну і сорам!

(Саўхоз Бярэзіно, Комсамольскі клюб).

У саўхозе Бярэзіно маецца комсамольскі клюб. Займае ён даволі значнае памяшканьне, у ліку пяці пакояў. Клюб мае залю і сцэну, куток Леніна, бібліотэку і атрымлівае газэты. Клюбу адпушчаюцца за кошт саўхозу газа і дровы. Умовы дзеля працы добрыя і нават мала дзе маюцца такія ў ячэйках на вёсцы. Але ня гледзячы на гэткія становучыя ўмовы ў клюбе нічога ня робіцца. Працы ў ім няма. Моладзь, якой у саўхозе шмат зусім ня цікавіцца клюбам і наогул не наведвае яго, а ў вольны час ходзіць з адной хаты у другую. У чым-жа справа? А ўся справа ў нядбалых адносінах саўхозкай комсамольскай ячэйкі да працы ў клюбе.

Мяцеліца.

Непарадкі на вечарох.

(Менск, клюб ім. КІМ'у).

Калі напрыклад, ты хочаш паслухаць той ці іншы даклад альбо гутарку ў клюбе ім. КІМ'у, дык гэта табе ня зусім удасца з за... недысцыплінаванасьці некаторых нашых комсамольцаў, якія гутараць, галдзяць, ходзяць і... нічым ня цікавяцца.

Мая прапанова адміністрацыі клюбу—урэгуляваць гэтае пытаньне, каб з клюбу комсамольцы выносілі тую ці іншую карысьць.

П. Чыкун.

Няма дзе правесьці час.

(Ст. Менск, МББ чыгункі).

На станцыі Менск МББ чыгунк. налічваецца да 400 чалавек моладзі Лічба не малая. Адчак сярод гэтай моладзі культурна-выхаваўчая праца не праводзіцца, ня гледзячы на тое што маецца досыць добра абсталяваны клюб чыгуначнікаў з юнсэкцыяй, якая «існуе» ўжо два гады.

Магчымасьці ж наладжаньня культурна-масавый працы сярод моладзі у клюбе маюцца: клюб заняты на працягу тыдня толькі два дні—ў суботу і нядзелю, за выключэньнем якога небудзь сходу.

Аднак бяда ў тым, што працаўнікі клюбу не разумеюць важнасьці культурна-масавай працы сярод моладзі.

Калі, напрыклад, спытаеш у іх: чаму ў клюбе так мала прыстасавана праца да моладзі, дык адказваюць: клюб рабочы і мы працу прыстасоўваем да дарослых рабочых і нам няма калі займацца вашымі „весялосьцямі".

Да таго і праўленьне клюбу не дае магчымасьці праводзіць тое, што жадае наладзіць юнсэкцыя. Напрыклад: гульні—недазваляюцца, скокі—забараняюцца, сьпяваць — таксама нельга.

Бібліотэка і чытальня зачыняюцца а 9-ай гадзіне увечары, а раз чытальня зачынілася, дык і рабіць у клюбе няма чаго.

І ў выніку ўсяго, моладзь праводзіць час не ў клюбе, а па піўных, а пасьля хуліганіць па вуліцах.

Няма дзе правесьці вольную гадзіну.

Мікола.

Гастралёр з дзяржсьпірту.

I.

Ціха і сумна на вуліцах мястэчка Астрашыцкі Гарадок, толькі і відаць было як хто небудзь раз па разу пройдзе па ёй—па сваёй патрэбе.

Была цёплая восень, сонца стаяла яшчэ высока і кідала свае праменьні на ўсе абшары мястэчка. Жыцьцё ў мястэчку было аднальковае: як учора так і сёньня, як сёньня так і заўтра. Мо' яно цягнулася і да гэтуль, але сталася інакшай...

У гэты самы час на гарызонце мястэчка зьявілася нейкая асоба, якая хоць і была з вялікім партфэлям, але ўражаньня якога можна было чакаць, не атрымала. На яго паглядзелі як на звычайнага „прадстаўніка" гораду.

Толькі комсамольцы зацікавіліся даведацца: Ці комсамолец ён?

Ён прыехаў. Ён быў нікому не знаёмы.

II.

Пачалося гэта зусім проста. У адну з верасьнёўскіх нядзель, калі Волька зьбіралася увайсьці у кіно, каб пабачыць Мэры Пікфорд, нейкі малады чалавек прапанаваў ёй білет.

Душа Волькі была не запэцканая як паслужны сьпісак яе бацькі, а жыцьцёвыя навальніцы ніколі незамрачалі яе дваццаці гадовых блакітных вачэй. Таму, без усялякіх хістаньняў, яна прыняла паслугі незнаёмца.

Піаніна адхарквала „Калямбіну" (што грала мястачковая вядомасьць—Марфа) і ўбаюканая гукамі Волька не супярэчыла, калі незнаёмец перашоў да другой стадыі знаёмства—узяў руку яе крэндзелем.

Даведалася яна, што імя яго Алесь, што яму роўна 22 гады і да таго-ж сапраўдны член ЛКСМБ. Таксама, даведалася яна, што ён працуе на вельмі „адказнай" працы, атрымлівае 42 рублі, і вельмі „перагружан", а „сёньня вышаў праветрыць ня толькі мазгі, але і душу, якая, да рэчы, на адзінокім становішчы састаіць і ані якае нагрузкі ня мае".

Волька ня зусім зразумела, чаму гэта «да рэчы», але ў гэты час запалілася сьвятло і публіка хлынула к выхаду. Алесь як «вучціві» працягваў свае паслугі Вольцы наконт даставкі яе дамоў бо „наш шлях наогул сходзіцца". Гэта „наогул" Волька не разумела, але ля самай брамы яе спадарожнік у заключным слове сказаў: я вас ведаю ўсяго дзьве гадзіны. Але што гэты час. Гэта міраж і дробна буржуазныя забабоны. Я адразу прыкмеціў у вашых вачох такія небасхілы, якія мне ніколі не даваў ні адзін тэзыс, ні адзін абежнік. Конкрэтная прапанова:—Накіруйце ў маё распараджэньне Вашу руку і сэрца з іншымі прыналежнасьцямі".

Ня будзім уцікаць у інтымнасьць іх гутаркі і нагэтым закончым другую частку.

III.

Знаёмства Алеся з Волькай заходзіла ўсё далей і далей. Па вечарах яны выходзілі за мястэчка, туды, дзе прырода маніла ў свае харство. Яны выходзілі на бераг возера, і парачка ўлюблёных пад воплескі хваляў дарыла гарачыя салодкія пацалункі... Яны захапляліся і кожны ў сваіх думках па некалькі разоў перабіраў усю гісторыю свайго знаёмства. Гэтыя думкі падчас спыняліся, і тады ўжо пацалункам ня было канца.

Гэтак было кожны вечар... Так цягнулася з месяц, каханьне іх зайшло так далека, што спыніць яго ня было магчымасьці, як толькі пайсьці ў ЗАГС і там—шлюб.

І яны пажаніліся, яны сыйшліся ў восень, у той самы час, калі возера стала бурным, ліў дождж, на вуліцах мястэчка было па калені гразі, сумна, адзінока. Шчасьлівая парачка цэнтр цяжкасьці каханьня перанесла ў цёплы куток, бо яны нікога ўжо не баяліся. Яны цяпер перайшлі ў звычайнае будзённае жыцьцё. І так захапіліся жыцьцём, што тав. Алесь ня толькі пра комсамолу забыўся, а і свой чын, які вызначаўся у „дырэктары" крамы, у якой прадаваўся спіртны напітак. Усе гэта ён перамяніў на чын жанатага чалавека. У краме кісла „Горкая", паніжаліся градусы, ржавелі запоры.

У гэты самы час Алесь амаль, што не кожны дзень рабіў экскурсіі ў Менск, каб лепш абгледзіць усе піўныя і зрабіць заключэньне аб крэпасьці і ўплыву напіткаў. Таксама не запамятаваў і Савецкай вуліцы па вачох...

Жылося соладка. Ён не зважаў на ўсе перашкоды і ўлаўнены ў свае знаёмства з Менскім „Начальствам", раскідваў манету на ўсе бакі, але раптам... Здарэньне. Здарэньне важнае, цікавае, для яго страшэнае не прыемнае, якое як бы куляю панясло яго ў глыбокае нетра, адкуль выбрацца вельмі цяжка.

IV

У мястэчку стала ціха. Толькі дзе ні дзе чутны былі перасуды старых баб і дзяўчат. Хутка ўсё мястэчка як у бубен званіла аб шчасьлівым з погляду адных, і не шчасьлівым з погляду другіх,—шлюбе.

Перасуды падыходзілі к канцу, як і заўсёды бывае. Ужо нават пачалі забывацца. Але здарылася новая гісторыя

Алесю жонка абрыдла. Чаму?—ніхто ня ведае. Гавораць некаторыя, што яна нядала яму грошай. Ён усялякім чынам стаў прыдзірацца да яе і нарэшце кінуў. Ён уцёк ад яе, ён пашоў шукаць новай, сьвежай...

Ён знайшоў... Зноў пацалункі, узаемнае давер'е. Пачуцці, каханьня. Далей ЗАГС, шлюб, падарункі... Тыднёвае салодкае жыцьцё... Але, тыдневае болей нельга было... Алеся згубілі тыднёвыя шлюбы, бо гэта быў трэці.

Тут усё абарвалася. Знаёмыя, на якіх ён спадзяваўся, адчураліся. Хвалі навальніцы нясьлі яго ўсё глыбей і глыбей. Ён змагаўся з імі. Але ня позна.

Алесь сядзеў і абдумваў, як яму выйсьці сухім і чыстым. Ён перабіраў усе магчымасьці. Пад гэтыя думкі пачаў супакойвацца. Так ён супакоіўся, што нават прыдрамнуў. Сьнілася яму:—горад Менск. Ён сядзіць у рэстаране. Падыходзіць да яго незнаёмы хлапец і маніць за собой. Ён не спрачаецца—ідзе за ім. Па вуліцах, сьніцца яму, усе людзі глядзяць на яго,—гэта прыдае яму гонар. Ён стараецца яшчэ больш падняць галаву, каб стаць вышэйшым за ўсіх... А раптам міліцыянэр падыходзіць да яго бярэ за руку і вядзе. І вось ДОПР. Алеся ўвялі ў пакой. Мільганула думка: „На ужо-ж за растраты"... І тут Алесь прачнуўся. Па яго целу прабягаў мароз і ён увесь дрыжэў як асінка. Яму маляваласа далейшае жыцьцё. У думках уставалі—Менск, ДОПР, Зоська... Раздумываць доўга ня прышлося, бо ў камеру увайшоў міліцыянэр і абвясьціў, што трэба зьбірацца ў Менскі ДОПР.

* * *

Гэта факт з жыцьця мястэчка Астрашыцкі Гарадок, Менскае вакруг. У верасьні ў мястэчка прыехаў комсамолец Меляшкевіч, які не пасьпеўшы агледзіцца, растраціў каля 800 рублёў, будучы загадчыкам крамы Дзяржспірту. Меляшкевіч за час свае службы пасьпеў жаніцца 2 разы, жаніцьбаю ён хацеў дасягнуць, каб яго жонкі пакрылі ўсю недастачу у касе. Гэта яму не удалося. Яго арыштавалі і пасадзілі ў Менскі ДОПР. За ўсе гэтыя факты ячэйка ЛКСМБ выключыла Меляшкевіча з Комсамолу бяз права паступленьня,

Хв. Смарговіч.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Сельска-гаспадарчыя гурткі.

На апошніх вестках у працу сельска-гаспадарчых гурткоў моладзі у весцы ўцягнута больш 500 тысяч чалавек беспартыйнай моладзі. Шмат якія гурткі існуюць ужо па некальні год, прарабілі вялізарную працу па перабудаваньні сельскай гаспадаркі і карыстаюцца заслужанай пашанай і вядомасьцю сярод сялян.

За апошні час у сувязі з агульным ажыўленьнем працы саюзу у прыватнасьці, ажыўленьнем працы па лініі добраахвотных арганізацыі моладзі—узмацніцца таксама праца с.-г. гурткоў.

Рост комсамолу у весцы.

ЦК УсеКП заслухаў даклад ЦК УсеЛКСМ аб росьце комсамолу у весцы і яго рэгуляваньні.

У прынятай пастанове ЦК адзначыў: узмацненьне ўплыву комсамолу у масах сялянскай моладзі, выявіўшыся у росьце шэрагаў КСМ, рост і павялічаньне батрацкага асяродка у саюзе і значныя посьпехі у справе ўцягненьня у саюз серадняцкай моладзі.

Недастатковай прызнана праца па ўцягненьню у шэрагі КСМ беднацкай моладзі.

Улічваючы ўзрастаючую актыўнасьць кулацкіх слаёў у весцы і іх імкненьне узмацніць свой ўплыў на моладзь неабходна рашуча змагацца са спробамі пранікнуць у шэрагі саюзу такіх элементаў моладзі, якія могуць стаць праваднікамі кулацкіх настрояў.

Комсамол Украіны.

Комсамольская організацыя Украіны (ЛКСМУ) налічвае у сучасны момант у сваіх шэрагах 366260 сяброў саюзу і каля 15000 кандыдатаў. У параўнаньні з пачаткам мінулага году організацыя павялічылася на 55000 чал. Адпак тэмп росту за апошні час зьмяншаецца. На 1 студзеня 1926 г. у організацыі было 297000 чал., на 1 красавіка 330724 ч., на 1 чэрвеня 352000 ч. Такім чынам, за 1 чвэртку мінулага году у організацыю уступіла 32000 ч., а за другую чвэртку толькі 22000 ч.

У Менакругкоме ЛКСМБ.

Досьлед Смалявіцкай організацыі.

Бюро акругкому вылучыла камісію, дзеля досьледу усіх галін комсамольскай працы у Смалявіцкім раёне.

Вучот рабочай моладзі.

Акругком пастанавіў да 1 лютага 1927 г. правесьці вучот рабочай моладзі. У мэтах падрыхтоўкі да вучоту 8 студзеня была склікана нарада спэцыяльна вылучаных ад ячэек таварышоў, сумесна з прадстаўнікамі моладзі у ЦП саюзаў і прадстаўнікамі фабзаўмяскомаў.

Адзіным фронтам наступаюць на хуліганства.

Саўнарком распрацаваў план барацьбы з хуліганствам.

Яна будзе праводзіцца зараз асобнымі наркаматамі.

Нар. Кам. Аховы Здароўя узмацняе санітарна-асьветную працу па змаганьню з алкагалізмам шляхам дакладаў, лекцый, кіно-перасовак і інш.

Нар. Кам. Сац. Забясьпечаньня і «Чырв. Крыж» аказваюць матэрыяльную дапамогу вызваленым з турмоў і гэтым папярэджваюць рост хуліганства.

Нар. Кам. Працы прадстаўляецца права рэгуляваць выдачу дапамог ад страхкас асобліва злосным хуліганам і часова згубіўшым працаздольнасьць на глебе пьянства.

Па Наркамюсту органы дазнаньня маюць права рабіць асабовае затрыманьне хуліганаў да суду. Ва усіх акруговых цэнтрах засноўваюцца дыжурныя камеры па хуліганскіх справах.

Культурна-асьветныя організацыі наогул павінны узмацніць працу фізкультурных гурткоў сярод гарадзкой і сельскай моладзі, наогул клюбную працу і г. д.

Да усяе гэтае працы прыцягваецца КСМ.

Адначасна Сав. Нар. Кам. прапануе прыняць удзел у выкараненьні хуліганства усяму савецкаму грамадзянству і грамадзкім організацыям.

У Полацкай комсамоліі

○ АК ЛКСМБ заслухаў даклад Полацкай філіі «Маладняк».

Адзначаючы дасягненьні у працы філіі (організацыйнае афармленьне філіі, палепшэньне сувязі з раёнамі і інш.), а таксама падкрэсьлены і недахопы (паслабленьне выхаваўчай працы з прычыны звароту большасьці увагі на выдавецкую працу, у творах маладнякоўцаў мала высьвятляецца жыцьцё і быт вясковай комсамоліі і інш.)

АК КСМ даў філіі цэлы шэраг прапаноў (зьнішчэньне маючыхся недахопаў, разам з КСМ праводзіць распаўсюджваньне маладнякоўскай літаратуры і інш.).

○ Акруговая конфэрэнцыя ЛКСМБ скліквецца 14 лютага 1927 г.

○ 20 студзеня г. г. адбудзецца дывізыйная конфэрэнцыя ЛКСМ.

Фабзавучы атрымаюць крэдыт.

Сав. нар. Гасп. БССР адпушчае у гэтым годзе крэдыт на утрыманьне 4-х школ ФЗВ у суме—45.000 руб. Супроць мінулага году навялічаньне на 10 проц.

Гэты крэдыт прадстаўляецца школам ФЗВ ф-кі «Дзьвіна» (Віцебск), „Спартак" (Шклоў), лесапілкі у Бабруйску і скурзаводу у Менску.

Усебеларускі бібліотэчны зьезд.

Галоўпалітасьветы намячае скліканьне ўсебеларускага бібліотэчнага зьезду з удзелам працаўнікоў дзіцячых бібліотэк.

У пачатку лютага склікаецца ўсебеларускі зьезд загадчыкаў хат-чытален на якім будуць прысутнічаць 500 дэлегатаў.

Адных стыпэндый мала

Як палепшыць быт студэнцтва.

Ва усіх ВНУ БССР налічваецца звыш 10.000 студэнтаў, з якіх толькі 6 проц. не забясьпечаны стыпэндыямі. Агульная сума стыпэндый у бягучым навучальным годзе дасягае —1.600.000 руб. Гэта максымальная лічба, больш якой адпушчана быць не можа.

З гэтае прычыны, ЦБ Пролетстудэнцтва узбуджана хадайніцтва перад урадам аб стварэньні на Беларусі Комітэту Палепшаньня Дабрабыту Студэнтаў, так званага «КУБУ».

ПРОФСАЮЗНАЯ ХРОНІКА

Досьлед вучнеўства

Саюз папяравікоў праводзіць досьлед становішча вучнеўства на прадпрыемствах: «Спартак» (Шклоў), «Фабрыка імя Сталіна» (Рагачоў) і Цэнтральне (Менск).

Досьлед мае мэтай палепшаньне умоў працы падросткаў на прадпрыемствах папяровай прамысловасьці БССР наогул.

Таксама будзе пашырана норма броні (з 8-мі да 10-ці проц. агульнага ліку рабочых).

Нарада дрэваапрацовачнікаў

22 студзеня адбудзецца у Менску усебеларуская нарада моладзі саюзу дрэваапрацоўчнікаў. Галоўныя пытаньні нарады: удзел моладзі у правядзеньні рэжыму эканоміі, раб. авансаваньне падросткаў ды інш.

Адначасна нарада падагуліць вынікі мерапрыемстваў па палепшаньню умоў працы моладзі: на фабрыцы «Красны Акцябр» (Мазыр), лесазаводзе «Рабочы» (Барысаў) і працкалектыве гнутага мэблю у Віцебску.

СУД.

Стась „заплаціў алімэнты".

Марылька Юдзіцкая аборта не зрабіла—хоць гэтага і жадаў Станіслаў Дамброўскі.

Калі на сьвет зьявілася дзіцё, Дамброўскі стаў унікаць спатканьняў з ёю.

Марылька ўрэшце, пасьля доўгіх разважаньняў, падала ў суд, які пры судзіў Дамброўскаму выплачваць на ўтрыманьне дзіцяці па пяць руб. у месяц.

Час вясны прашоў. Аб гэтым добра ведала Марылька Юдзіцкая. Дзіцяці ішоў 3-ці год. Марылька, якая недачакалася яшчэ алімэнтных узносаў—нанялася да селяніна Каласніскага—у падзёншчыцы.

Стаяў гарачы ліпень і ўся вёска Мартынавічы (Койданаўскі раён) жвава ўзялася за жніва. Марылька старалася таксама не адставаць — для падзёншчыцы-ж жніво самая прыбытковая праца.

28 ліпеня 1926 г. яна, як і заўсёды, устала раненька, накарміла і ўлажыла ў ложка дзіцянё і спакойна пашла на працу.

— У час абеду яна зьвярнулася дамоў і зьдзівілася, калі ня ўгледзіла дзіцяці на ложку. Марылька глянула на гліняную падлогу і ахнула. Ля печкі... ляжала дзіцё з праломаным чэрапам. Асколкі гліны старчалі ў крывавай галаўной ране. Навокал была кроў.

У памутнелай галаве Марылькі Юдзіцкай мільганула:

— Ста сь... Дам ..броў...скі...

Суд быў у затрудненьні. Сьведкі каваль Бяляўскі даваў паказаньні, што ўвесь гэты час Дамброўскі быў у яго кузьні — дапамагаў зубіць сярпы.

За недахопам улік у судзьдзяў был ужо замер спыніць разбор гэтае справы.

Але потым Бяляўскі прызнаўся. Аказалася, што яшчэ перад арыштам бацькі Дамброўскага і ён сам стаў яго паіць і прасіць, каб ён даў ня праўдзівыя паказаньні.

Справа пачала іначой разьбірацца і Стась ужо больш ня высьлізнуў. Менскі акруговы суд прыгаварыў яго да 8 год турэмнага зьняволеньня.

Вій.

На первянства...

6 студзеня г. г. увечары ў клюбе піонэраў (былая Менская кірка) пачаліся цяжка-атлетычныя спаборніцтвы на первенства Менскай акругі.

Адчыненьне спаборніцтваў вітаді: Наркамаховы Здароўя т. Барсукоў, ЦСПСБ—т. Гельбрайх ад спорткамісіі ЦК ЛКСМБ—т. Цайтлін.

Пасьля прывітаньняў удзельнікі спаборніцтваў у ліку 60 чал. прайшлі маршам праз усю залю клюбу. Апрача гэтага былі паказаны 2 рухі па падыняцьцю цяжараў:

1 Зжым двума.

2. Рывок адной рукою.

Спаборніцтвы працягнуцца 4-5 дзён. Аб выніках будзе зьмешчана ў «Чырвонай Зьмене».

К.

Фізкультура закінута.

(Мястэчка Лельчыцы Мазыршчына).

Комсамольская ячэйка ўлетку організавала гурток фізкультуры і дзякуючы добраму кіраўніку праца пашла як належыць. Хлопцы з вялікай зацікаўленасьцю адносіліся да заняткаў ад чаго атрымалі шмат карысьці.

Цяпер-жа ў зімовы перыод у нас фізкультура закінута, аб ёй ніхто і ня думае. А колькі-б дало карысьці моладзі катаньне на каньках, лыжах! Моладзь, падумай і зноў вазьміся, па летнему, за фізкультуру.

Е. Лельчук.

Новая літаратура

За апошні час выдавецтва ЦК ЛКСМБ „Чырвоны Зьмены" выпусьціла ў сьвет наступныя кніжкі:

Сталін.—Аб партыі. 24 стар. Цана 8 кап.

Сталін.—Аб комсамоле. 36 стар. Цана 8 кап.

Статут УсеЛКСМ. 32 стар. Цана 5 кап.

А. Сітцаў.—Як наша партыя кіруе краінай. 48 ст. Цана 10 к.

А. Падгорны.—Як мы будуем соцыялізм у нашай краіне. 52 ст. Цана 10 кап.

Партыя і комсамол аб працы піонэрскай організацыі Беларусі, рэдакцыяй ЦК ЛКСМБ і ЦБ ЮП. 72 ... Цана 15 кап.

Н. Вайнгауз.—У дапамогу дзетгурткам і рэдколегіям (на жур. мо...) 32 стар. Цана 5 кап.

Палітграмата вясковага комсамольца. Пад рэдакцыяй Я. Осьмава і Шукевіча-Траццякова.

Усе вышэйпамянёныя кніжкі можна купіць у кнігарнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

„Мяшчанка"—пастаноўка драмгуртка клюбу „КІМ".

Ці гэта наш рабфак?—Гурэвічы ў жыцьці і Гурэвіч у п'есе.—Мяшчанка ці дадатная асоба?—Урачыстыя прамовы ці урачыстасьць да радзе.

Драмгурток Цэнтральнага Комсамольскага клюбу «КІМ» дэманструе сваю першую больш-менш сур'ёзную мастацкую працу. Над п'есай тав. Галаўчынэра (ен жа рэжысэр) «Мяшчанка» гурток працаваў паўтара месяцы, на гэту справу аддалі шмат сіл і сродкаў.

Комсамольская маса з нецярплівасьцю чакала гэтай пастаноўкі. З нецярплівасьцю чакалі комсамольцы цікавы, добра—афармаваны спэктакль.

Ці апраўдаў спэктакль гэтыя чаканьні?

Тут нельга даць пэўны адказ. Пастаноўка выклікала вялікую зацікаўленасьць, аб ей існуюць самыя розныя і часта адзін процілеглыя думкі. У «Мяшчанкі» ёсьць ворагі і шчырыя прыхільнікі. Адны кажуць, што п'есу трэба безадкладна перарабіць; другія, наадварот, хваляць яе на усіх перакрэстках. На дыспуце, які наладзіла праўленьне клюбу «КІМ» пасьля грамадзкага прагляду п'есы, выступіла каля 20 чалавек і выступленьні не спыніліся-б, калі б позьні час не разагнаў усхваляваную аўдыторыю... Усе гэта кажа, што п'еса мае вызначаную грамадзкую каштоўнасьць, што яна (п'еса) закранае мітасьці хворыя бакі нашага быту, высоўвае спрэчныя пытаньні.

П'еса разгортваецца так: рабфаковец—комсамолец Міхась і рабфакаўка Вера кахаюць адзін другога. На думцы Міхася—тое, што Вера не жадае уступіць у палавое жыцьцё—ёсьць мяшчанства. У хуткім часе Міхась едзе на працу у вёску. Вера атрымлівае ад яго лісты, і, як раней, яго горача кахае. Тут на сцэне зьяўляецца Гурэвіч—добра знаёмы нам тып выскачкі, кар'ерыста і бюрократа, які вечна з портфэлям, вечна з высокімі, агульнымі выразамі, а па сутнасьці зьяўляецца пустым і гнілым хлопцам. Гурэвіч прыстае да Веры і атрымлівае рэзкі адпор. Упартасьць і «непрыстойнасьць» Веры страшэнна зьлуе Гурэвіча, ен клейміць яе крылатым слаўцом «мяшчанка» і робіцца яе ворагам. Здавалася б, што п'еса павінна і далей разгортвацца у гэтым напрамку. Але зьяўляецца новы тып—Шустры. Гэта сільны рабочы хлапец які любіць выпіць і пагуляць. Раз Шустры прыходзіць з вечарынкі «под градусом» у пакойчык Веры, якая ляжыць хворая у гарачцы (40 градусаў тэмпэратуры) і пасьля досыць кучнага дыялёгу кідаецца на гвалціць Веру (гэта пры 40 град. сазі), ратуючыся, хапае Шустрага за горла і душыць. На крык выходзіць зьбегаюцца рабфакаўцы і вызваляюць яго. Далей—справа разгортваецца хутка. Выканбюро рабфаку, які кіруе Гурэвіч, пастанаўляе выключыць Веру з рабфаку за тое што яна ледзь не задушыла Шустрага (!) і наогул нескла сябе трымае. Аднак, гэта пастанова сустракае рэзкі протэст з боку рабфакаўскай масы. У гэты момант Вера, абураная усім, што адбылося, калечыць свой твар, гожы твар брытвай... П'еса канчаецца тым што Міхась, які вяртаецца назад у горад, кідае Веру, бо яна ужо не такая прыгожая, як была раней...

І яна застаецца на рабфаку і уступае у шэрагі Комсамолу.

* * *

Вось, у некалькіх словах, зьмест п'есы.

Тут трэба у першую чаргу паставіць пытаньне: ці рэальна п'еса, ці праўдзіва яна адлюстроўвае жыцьцё рабфакаўскай моладзі? Мы, разумеецца, вельмі далекі ад таго погляду, што мастацкая пастаноўка павінна дакладна і пунктуальна адбіваць жыцьцё, што яна павінна быць выключна фотографічнай сапраўднасьці—і не больш. На тое гэта і мастацкая пастаноўка, каб некалькі згушчаць фарбы, у той-жа самы час не губляючы сувязі з рэальным жыцьцем. Але бяда што у «мяшчанцы» згублена гэтая сувязь з жыцьцем.

Калі бачыш «мяшчанку», дык здаецца, што на рабфаку толькі і заняты палавым пытаньнем. Праўда—гэта пытаньне балючае і аб ім многа гавораць. Але ці толькі гэта займае усё жыцьцё рабфакаўца і рабфакаўкі? А дзе-ж іх вучоба, спрэчкі, творчасьць, грамадзкая праца, барацьба за існаваньне? Усё гэта у п'есе не адбіта і нават не паказана, на фоне на якім разьвіваецца драма.

Далей: чаму эта пры спрэчках аб учынку Веры увесь рабфак падзяляецца на два лагеры: хлапцоў і дзяўчат. Хлапцы—супроць, а дзяўчаты—за Веру. Гэта-ж сьмешна! Такіх падзелаў не могуць існаваць у нашым рабфаку. Гэта ясна кожнаму.

Таксама няправільна пададзены Гурэвіч, Міхась і часткова Вера. Напрыклад—Гурэвіч да таго карыкатурны, да таго шаржыраваны, што не ўтварае ніякага уражаньня і ад яго вобраза проста са злосьцю адварачваешся. Падобныя псыхолёгічныя прабелы і у абрысоўцы іншых тыпаў.

Але галоўны недахоп п'есы у тым, што мала-рэальная і таму непераконваючая, яна не кажа тое, што хацела сказаць. Вера, абвінавачаная аўтарам, як дадатная асоба, згая не заслужана ні се клеймо „мяшчанкі"—аказалася сапраўды мяшчанкай! Іначай нельга растлумачыць яе учынак з калечаньнем твару. Калі сучасная рабфакаўка здольна на такую провінцыяльную брыдзь—дык яна бедная адышла ад мяшчанскай псыхолёгіі, ад мяшчанскіх прыемаў жыцьцёвай барацьбы. Такім чынам усе хітрыя сплятеньні п'есы аказаліся ні к чаму! Вера не выклікала спачуцьця у комсамольскай аўдыторыі і на яе баку не аказалася ніводнага чалавеку, а між іншым гэта было галоўнай выхаваўчай задачай п'есы.

Яшчэ некалькі слоў аб канцы п'есы. Апошні эпізод (пасяджэньне бюро ячэйкі) ніжэй усякай крытыкі. Ужо калі тав. Галаўчынэр „ста на ставку" на драматызм, на тое, каб заваструць увагу публікі на трагэдыі Веры—дык трэба было на гэтым і канчыць... Дык не! Дзецца найсумнейшы эпізод пасяджэньня бюро ячэйкі, на якое прыходзіць Вера і кажа тонам вінаватай дзяўчынкі — «я вінавата, прыміце мяне у Комсамол», пасьля чаго сакратар ячэйкі урачыстым тонам кажа прамову аб «спалатых недахопах» і г. д. і г. д. Як у амэрыканскіх кіно-фільмах: «урачыстасьць добрадзеі». Ня! Трэба было іншым спосабам паказаць паварот Веры да лепшага!

* * *

Як бы там ня было, а „мяшчанка" — першая сапраўдная мастацкая пастаноўка на падмостках Менскага Комсамольскага клюбу. Параўнаўча добрая гульня артыстых, удалыя дэкорацыі і той рэжысерскі размах, а і тут паказан—зьяўляюцца плюсамі п'есы, якіх ад яе нельга адняць. Іншая справа, што уся ідэолёгічная і бытовая установка п'есы—няправільная. Драмгурток яшчэ малады, ен здолее улічыць свае памылкі і пайсьці да новых дасягненьняў.

А гэтага чакае увесь комсамольскі Менск.

Міх. Гольдбэрг.



«Мяшчанка». Эпізод з II акту.

АПАВЯШЧЭНЬНІ.

Клюб „КІМ"

У нядзелю 9-га студзеня—п'еса „Мяшчанка". Пачатак у палове 10-га. Цана білетаў ад 20—25 кап.

Горрайком ЛКСМБ

У нядзелю 9-га студзеня, а 2-й гадз. дню адбудуцца заняткі сэмінарыя працаўнікоў дзіцячых дамоў. Павінны зьявіцца правадыры наступных атрадаў: Госторгбелу. Школы Швэйнікаў. Прац. Колектыву метадістых, П. К. швэйнікаў і П. К. друкароў. Яўка абавязкова.

У нядзелю, а 7-й гадз. увеч. будзе працаваць сэмінары наступных атрадаў: Камгас, Працасьветы, Праўмастацтва, Міліцыі, Наркамгандлю і Наркампрацы.

Юнсэкцыя працасьветы.

У нядзелю 9-га сьнежня, а 2-й гадз. дню—пасяджэньне бюро юнсэкцыі.

У нядзелю, а 3-й гадз.—пасяджэньне масавай камісіі.

Прапаў хлапец.

Аляксей Якімаў Лескавец, 16 год, прапаў бяз вестні. Прыметы наступныя: глуханямы, малога росту, старая сьвітка, у чорнае шапцы

Калі хто знойдзе прашу паведаміць па наступнаму адрасу: Вёска Суша Усакінскага сельсавету, Рагачоўскага раёну, Бабруйскае акругі. Якім Зьмітраў Лескавец.

ЗГУБЛЕНЫ:

Кандыдацкая картка ЛКСМБ № 702 выдадзеная Менакругкомам на імя Мельцар.

Сяброўскі білет ЛКСМБ № 8... выд. Менакругкомам тав. Урубскаму.

Папраўка

У 151 нумару „Чырвонай Зьмены" на 3 старонцы у артыкуле тав. Папова «Залізейная» было памылкова надрукавана «організацыі прыцягваюць да сабе на 100 120 чалавек моладзі» Трэба чытаць «1000 1200 чалавек».

Адказныя рэдактары: { А. БАРАНЬНІ / А. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23057 2-ая Дзяржаўдрукарня БДВ.